

НЕ РАБІЦЕ САЛАТУ З БЛЁКАТУ 3



ШТО ПАДКАЗВАЕ ЦЕЛА? 6

13 МАЯ 2020 г. СЕРАДА

№ 91 (29205)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

# «Падтрымліваць трэба тых, хто мае патрэбу ў падтрымцы і хто сам варушыцца»

## Прэзідэнту далажылі аб праекце ўказа «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян»



Фота БелТА.

**Чалавеку трэба працаваць, каб карміць сям'ю. Гэта заўсёднае сваё патрабаванне кіраўнік краіны агучыў і ўчора, перад пачаткам даклада. «Калі ў чалавека няма работы, вакансій дастаткова, у тым ліку ў Мінску. І ў гэты няпросты час чалавек мусіць спакойна пражыць, уладкаваўшыся на іншую работу — хай не зусім прымальную і любімую ім», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.**

Раней Прэзідэнт папярэджваў наймальнікаў, што ў час, калі сусветная эканоміка яшчэ не разгарнулася цалкам пасля калапсу, для нас вельмі важна захаваць працоўныя калектывы. ***Катэгарычнае патрабаванне беларускага лідара: звальненне людзей — недапушчальнае.***

Што да падтрымкі асобных прадпрыемстваў і асобных грамадзян, усе сродкі, якія магчыма, павінны быць накіраваныя на месцы. Аб гэтым прасілі і губернатары, каб самастойна вызначыць, каму патрэбная падтрымка. Было прынята і адпаведнае рашэнне.

***«Падтрымліваць трэба тых, хто мае патрэбу ў падтрымцы і хто сам варушыцца. Трэба і самім шукаць гэту работу»,*** — адзначыў Прэзідэнт.

Ён зноў прывёў у прыклад установы грамадскага харчавання, якія пераарыентаваліся і пачалі працаваць з дастаўкай ежы на дом ці на работу. Але каго і як падтрымліваць на месцах, будуць высвятляць мясцовыя ўлады.

На ўзроўні кіраўніка краіны задача — разгледзець стратэгічныя кірункі. Тая ж «Белавія», якую Прэзідэнт часта згадвае, не датычная да таго, што закрыліся межы і аэрапорты (акрамя Нацыянальнага аэрапорта Мінск). Калійная галіна таксама прынесла мала даходу, бо закрыліся рынкі, але «Беларуськалій» дамовіўся з Кітаем і іншымі рынкамі на пастаўку прадукцыі, паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

«Людзі варушацца, людзі стараюцца дамовіцца. ***Так, сёння немагчыма паставіць кудысьці на рынкі прадукцыю, але трэба дамовіцца. Праз тыдзень-месяц адкрыюцца рынкі, і ў вас будзе гатовы дагавор — вы паставіце свой тавар.*** І гэта таксама форма работы», — лічыць Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што ў Беларусі не спыненая ніводная вытворчасць.

«Мы проста папярэдзілі людзей — беражыце сябе, і сказалі, як можна сябе зберагчы. І сітуацыя ў Беларусі сёння з вірусам і іншымі захворваннямі, якіх у нас хапала і хапае, цярпімая. ***Мы не кажам, што ў нас усё добра, што ўжо Бога за бараду ўхапілі, не. Але той метад, які мы выкарыстоўваем ужо трэці месяц, прыносіць свой вынік»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што па прыкладзе нашай краіны падобным шляхам ідуць і некаторыя іншыя дзяржавы.

### НАСТУПСТВЫ АД СПЫНЕННЯ ЭКАНОМІКІ

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад і заходнія краіны, эканоміка якіх паціху пачынае працаваць (пры тым, што смяротнасць ад хвароб, абцяжараных COVID-19, у іх за суткі большая, чым у Беларусі за ўвесь час эпідэміі).

Ён звярнуў увагу і на аналагічнае становішча ў Расіі, якая адкрыла будаўнічы комплекс, прамысловыя прадпрыемствы, іншыя асноўныя сектары эканомікі. «Гэта дзевяноста з лішкам працэнтаў насельніцтва, якое выйдзе на работу. Багатая Расія, у якой назапашаны велізарны золатавалютны рэзерв і Фонд нацыянальнага дабрабыту, зразумела, што могуць быць дрэнныя наступствы», — пракаментаваў кіраўнік Беларусі.

### УСЯ ЎВАГА — ВЫРАТАВАННЮ ЖЫЦЦЯЎ

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў, што вельмі паглыблены ў праблему захваральнасці. Учора ён запатрабаваў прагноз не па новай каранавіруснай інфекцыі, а непасрэдна па ўсіх пнеўманіях.

«Не толькі ў нас, паўсюль праблема № 1 у лячэнні — гэта пнеўманіі. Што да пнеўманій, то ў нас, дзякуй богу, хоць і ёсць патроху па краіне прырост, але гэта ўжо не той прырост, які мы фіксавалі нават два-тры тыдні таму. Дай бог нам на гэтым узроўні вытрымаць», — падзяліўся кіраўнік дзяржавы.

***Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што за паказчык смяротнасці насельніцтва службовыя асобы «адкажуць галавой». Іншыя лічбы праз некаторы час забудуцца, а памяць аб загінулых, якіх можна было выратаваць, але не выратавалі, застанецца. «Жалезна трэба патрабаваць ад Міністэрства аховы здароўя і ўрачоў захавання жыцця людзей.*** Я аб гэтым у храме нядаўна казаў. І я гэта бяру на сур'ёзны кантроль», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### ЛЯЧЫЦЦА Ў БАЛЬНІЦЫ, ДАЛЕЧВАЦЦА Ў САНАТОРЫІ

Аляксандр Лукашэнка адрэагаваў на чуткі, што з бальніц хворых нібыта выпісваюць на далечванне ў санаторыі. «Мы лечым людзей у бальніцах. І маё непахіснае жорсткае патрабаванне: ні ў якім выпадку ў інфекцыйных бальніцах не ператрымліваць людзей, якія папраўляюцца, калі ёсць нармальная дынаміка ў лячэнні, калі ўрачы бачаць, што чалавек сябе нармальна адчувае. Мной прынята рашэнне: калі чалавек пайшоў на выздараўленне, мы яго пераводзім на санаторна-курортнае далечванне». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што нельга адпраўляць на такое далечванне чалавека, які не паправіўся, бо яму стане горш і ён «праз двое-трое сутак вернецца назад». Праўда, з моманту ўвядзення гэтага метаду такіх выпадкаў было ўсяго толькі два (вельмі пажылыя людзі), а ўсяго перамяшчалі з бальніц на далечванне тысячы людзей.

СТАР. 2

Энергетыка

# АЭС рыхтуецца да пуску ў ліпені

## Пра ядзернае паліва, атамшчыкаў-практыкаў і грамадскія слуханні

**Неабходныя падрыхтоўчыя работы для пуску атамнай станцыі праводзяцца на станцыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі нарматыўных дакументаў і з дасягненнем пэўных параметраў па кожным абсталяванні і тэхналагічнай сістэме. Ядзернае паліва для загрузкі першага энергаблока, што было дастаўлена на АЭС у пачатку месяца, ніяк не можа паўплываць на тэрміны фізічнага пуску. Да яго станцыя будзе гатова пасля атрымання адпаведнай ліцэнзіі рэгулятара, што, як мяркуецца па графіку, адбудзецца ў ліпені. Пра гэтыя і іншыя аспекты падрыхтоўкі АЭС да пачатку работы падчас відэабрыфінгу паведамілі спецыялісты.**

### Упэўненасць у гатоўнасці

На першым энергаблоку Беларускай АЭС ужо завершаны этап гарачай абкаткі абсталявання, у рэактар загружаны імітатары ядзернага паліва, праведзены ўвесь цыкл выпрабаванняў на прамежкавых і рабочых параметрах цепланосьбіта тэхналагічнага абсталявання ядзернай устаноўкі.

*— З 15 красавіка пачалі рэвізію абсталявання рэактарнай устаноўкі, якая робіцца ў аб'ёме, прадпісаным рэгламентам. Яшчэ неабходна правесці 306 выпрабаванняў тэхналагічных сістэм і завяршыць іншыя работы, якія не датычацца абсталявання. Прынамсі, здаць у эксплуатацыю больш за 2208 тэхналагічных і санітарных памяшканняў з усімі тэхналагічнымі сістэмамі, якія там ёсць,* — расказаў **Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі.**

На другім энергаблоку вядуцца агульнабудаўнічыя работы, а таксама мантаж асноўнага тэхналагічнага абсталявання. Важнай з'явай стала падача напружання па штатнай схеме на размеркавальную прыладу для атрымання энергіі на ўласныя патрэбы.

СТАР. 2

# ВЯСНА Ў ГРУШАЎЦЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У гэтым сталічным мікрараёне, які знаходзіцца, лічы, у цэнтры, па першай лініі метро, цесна суседнічаюць сучасныя гмахі і невялікія дамкі прыватнага сектара. І красуюць старыя пладовыя дрэвы, якія некалькі дзесяцігоддзяў таму былі чыімсьці садам...**

# «Хочацца, каб усё хутчэй скончылася і ўсе былі жывыя...»

## Аб гэтым марыць Сяргей ШАПАРТАЎ, загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Магілёўскай інфекцыйнай бальніцы

**З 4 красавіка — гэта перадавая, дзе людзі, змяніўшы белыя халаты на супрацьчумныя скафандры, ваююць з новым захворваннем. Менавіта ў гэты дзень сюды трапіў першы пацыент з COVID-19. І цяпер іх прывозяць сюды ўжо рэгулярна. Хоць, як сцвярджае суразмоўнік, сітуацыя пакуль не крытычная. На 11 мая ў рэанімацыі на шэсць месцаў былі свабодныя і ложкі, і апараты ШВЛ. У сярэднім «кавідныя» хворыя праводзяць у рэанімацыі 6-7 дзён, потым іх накіроўваюць у іншыя аддзяленні. Магілёўская «інфекцыёнка» разлічана на 134 месцы і пакуль таксама цалкам не загружаная.**

— У нас усё пачалося пазней, чым у Мінску ці Віцебску, практычна на месяц, невядома як будзе далей, — кажа загадчык аддзялення. — Пакуль паступаюць у асноўным людзі ва ўзросце. Самай малодшай было 45 гадоў. Была таксама 91-гадовая бабуля, не так даўно мы перавялі яе ў звычайнае аддзяленне. Наогул праз рэанімацыю з 4 красавіка прайшло 17 пацыентаў. Нашмат болей іх у Магілёўскай бальніцы № 1. Яна ў пяць разоў магутнейшая, і рэанімацыя там вялікая.

СТАР. 3



Фота з архіва Сяргея ШАПАРТАВА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША прадказалі ўзровень беспрацоўя да 25 працэнтаў



У красавіку беспрацоўе ў ЗША дасягнула 14,7 працэнта, што стала самым высокім узроўнем з часоў Вялікай дэпрэсіі. А ў маі сітуацыя стане толькі горшай, паколькі скарачэнні ўсё часцей закранаюць «белых каўнерыкаў», паведаміў Bloomberg. Узровень беспрацоўя можа на піку перавысіць 20 працэнтаў, заўважыў каналу CBS дарадца Белага дома Кевін Хэсет. У сваю чаргу, міністр фінансаў Стывен Мнучын у эфіры канала Fox заявіў, што рэальны паказчык і ўвогуле можа складаць каля 25 працэнтаў. Ён адзначыў, што гэта вельмі трывожныя лічбы, але прадказаў, што трэці і чацвёрты кварталы гэтага года будуць «лепшыя», а 2021 год — «выдатны». Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў, што «не спяшаецца» ўводзіць новыя меры падтрымкі эканомікі, аднак яго дарадцы ўжо вядуць перамовы з кангрэсменамі. Новы пакет мер дэмакраты і рэспубліканцы будуць абмяркоўваць больш актыўна, чым раней уведзеныя меры, адзначае Bloomberg.

### Усіх жыхароў 11-мільённага Уханя пратэстуюць на каранавірус

Гарадскія ўлады кітайскага Уханя распарадзіліся правесці скрынінг усіх жыхароў мегаполіса на каранавірусную інфекцыю, перадае выданне Pengpai. СМІ паведамляе, што на працэс тэсціравання з выкарыстаннем нуклеінавых кіслот адводзіцца 10 дзён. У канцы мінулага тыдня ва Ухані ўпершыню пасля пачатку красавіка быў выяўлены новы выпадак заражэння каранавірусам, а таксама 16 бессімптомных носьбітаў, усе выпадкі насілі лакальны характар. Праз суткі ў пяцярых носьбітаў выявіліся клінічныя прыкметы хваробы, яны былі перакваліфікаваныя ў пацверджаныя выпадкі. Пасля гэтага ўзровень эпідэміялагічнай пагрозы гарадскога раёна Дунсіху павысілі з нізкага да сярэдняга. Кітайскія вірусолагі папярэджвалі аб небяспецы, якую ўяўляюць бессімптомныя заражаныя, паколькі яны могуць стаць крыніцай новага ўсплёску выкліканай каранавірусам пнеўманіі. Для таго каб гэтага пазбегнуць, і прынята рашэнне аб усеагульным тэсціраванні.



### Тайланд мяркуе ўвесці падатак для турыстаў

Пасля заканчэння пандэміі ўсіх турыстаў, якія прыбываюць у Тайланд, могуць абавязаць плаціць збор у памеры да 300 батаў (каля 9 долараў), паведаміла выданне Bangkok Post. Падатак для тых, хто прыляціць на самалёце, плануецца ўключыць у кошт авіябілетаў. Спосаб збірання збору з турыстаў, якія прыбываюць наземным або марскім транспартам, пакуль не вызначаны. Новы падатак стане часткай 20-гадовага нацыянальнага плана, які павінен забяспечыць дзяржаўныя органы пастаянным прыбыткам для падтрымання і стабілізацыі эканомікі, адзначыла Bangkok Post са спасылкай на кіраўніка міністэрства турызму і спорту краіны Піпата Ратчакітпракана. Канчатковае рашэнне пра новы падатак урад Тайланда абвесціць не пазней як у чацвёртым квартале. Па звестках Мінтурызму, у 2019-м краіну наведалі 39 млн замежных гасцей. Сёлета Тайланд не чакае аднаўлення міжнароднага турызму раней за кастрычнік—снежань.

ISSN 1990 - 763X

20091>

9 771990 763008

## КОРАТКА

- Праект новай антыінфляцыйнай праграмы падрыхтуюць да 1 жніўня.
- **Першы беспілотны электробус пратэставалі ў «Вялікім камені».**



- На рэстаўрацыю плошчы Перамогі ў Мінску выдаткавалі больш за Br11 млн.
- **Урачыстасці з нагоды 500-годдзя Жыровіцкага манастыра перанесены.**
- ЦВК стварыў пазабюджэтны фонд для дадатковага фінансавання выбараў Прэзідэнта.
- **У Віцебскай вобласці стаўка адзінага падатку для прадпрымальнікаў і фізічных асоб зніжана ў два разы.**

Соцыум

# СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ АДНОСІН

## Разважанні напярэдадні Дня сям'і

**Ці заўважылі вы, як падчас гэтай сусветнай навалы ўздымаецца каштоўнасць сям'і? Правільней сказаць, не ўздымаецца, а высвечваецца, падкрэсліваецца, нагадвае пра сябе. Хоць, здавалася б, і так ясна, што галоўны свой вопыт і духоўны падмурак чалавек атрымлівае ў сям'і. Проста апошнім часам той самы чалавек вельмі шмат ганяўся за іншымі каштоўнасцямі. Амаль уся сістэма інфармацыйнага грамадства, лічы, накіраваная на стварэнне прыгожай карцінкі быцця, якая трывала асядае ў свядомасці асабліва маладога індывідуума. У аснове вобраза прыгожага жыцця, вядома, знаходзяцца грошы, за якія як быццам бы ўсё можна купіць.**



### АХВЯРАВАЛА НЫРКУ СЫНУ

Але ж, як аказваецца, не ўсё. Апошняе становіцца зразумела на прыкладзе многіх і многіх сем'яў, якія змагаюцца за здароўе сваіх дзяцей, падтрымліваюць блізкіх у хваробах ды іншых няшчасцях. Ну хто б яшчэ быў здольны на такое, калі не маці? Кажу зараз пра Алену Клімовіч з Ружан, з якой пазнаёмілася ў пачатку 2015 года. Алена Мікалаеўна аддала сыну сваю нырку. Такім чынам у Сашы паявіўся шанц на жыццё. Бо да перасадкі органа тры разы на тыдзень яму трэба было ездзіць у суседні райцэнтр на працэдуру гемадыялізу.

СТАР. 5

# «Падтрымліваць трэба тых, хто мае патрэбу ў падтрымцы і хто сам варушыцца»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нават тыя, у каго хвароба працякае лёгка ці бессімптомна, — таксама пастаянна ў полі зроку ўрачоў. «У Мінску, дапусцім, створана каля 270 брыгад, якія трымаюць на кантролі ў сваіх раёнах пэўную колькасць гэтых хворых. Яны на кантакце, і, калі ледзь якое пагаршэнне, мы неадкладна шпіталізуем. І гэта сябе апраўдала», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

***Ачаговы, а не франтальны метад барацьбы — асаблівасць змагання з «кавідам» у Беларусі, да яго падштурхнуў досвед. Мы рэагуем на хваробы, зыходзячы з той сітуацыі, якая складваецца,*** растлумачыў Прэзідэнт.

Ён заклікаў працаваць без істэрыі і анансаваў у найбліжэйшы час адмысловы кантроль лячэння, далечвання і назірання пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй.

### Кожная краіна выкарыстоўвае свае метады

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пагаварыў па тэлефоне з генеральным дырэктарам Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Тэдрасам Гебрэесусам. Размова была ініцыявана кіраўніцтвам СААЗ, паведаміла БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.

Кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя папрасіў расказаць пра становішча, якое на сённяшні дзень складваецца ў Беларусі, а таксама пацікавіўся, якая патрэбна падтрымка ад арганізацыі. Ён заявіў пра гатоўнасць пры неабходнасці такую дапамогу аказаць.

Прэзідэнт расказаў аб рабоце сістэмы аховы здароўя ў цэлым, абраных краінай стратэгіі і тактыцы ў супрацьдзеянні распаўсюджванню віруса. Ён акцэнтаваў увагу, што на сённяшні дзень непакой выклікаюць пнеўманіі, лячэнню якіх удзяляецца найбольшая ўвага. Галоўная задача, якую вызначылі для сябе ў Беларусі, — змагацца за кожнае жыццё, ні ў якім разе не дапукаць скачка ўзроўню смяротнасці.

Кіраўнік СААЗ адзначыў, што кожная краіна ва ўмовах пандэміі выкарыстоўвае свае метады барацьбы, рэагавання на сітуацыю, адзіных рэцэптаў і правілаў тут не існуе. Кіраўнік СААЗ падзякаваў Прэзідэнту і органам улады краіны ў цэлым за глыбокую ўцягнутасць у працэс, пра што ён добра дасведчаны.

Прэзідэнт запрасіў кіраўніка СААЗ наведаць Беларусь з візітам. Тэдрас Гебрэесус прыняў запрашэнне, ён паабяцаў прыехаць у нашу краіну пасля заканчэння пандэміі.

**❍ У ТЭМУ**

## ШМАТДЗЕТНЫМ І ІНВАЛІДАМ

Аб праекце Указа «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян» Прэзідэнту далажыў прэм'ер-міністр Сяргей Румас.

Як паведаміла журналістам **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** праект указа прадугледжвае падтрымку шматдзетных сем'яў, людзей з інваліднасцю. У прыватнасці, абмяркоўвалася сацыяльная абарона, пенсійнае забеспячэнне ўразлівых слаёў насельніцтва і праблемы сем'яў з бясплоднасцю.

«Што да шматдзетных сем'яў, пытанне сацыяльнай аховы — гэта ўдасканаленне падыходаў па дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе. Гэта ўнікальны механізм, які ёсць сёння ў краіне. Сапраўды, сёння аказваецца адрасная дапамога тым людзям, у якіх узровень даходаў ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму», — расказала міністр.

Шэсцьдзясят працэнтаў атрымальнікаў гэтай дапамогі — шматдзетныя сем'і. Па словах Ірыны Касцевіч, аналіз паказаў, што патрабуецца ўдасканаленне гэтага механізма. Прэзідэнт падтрымаў прапанаваныя падыходы.

«Што да пенсійнага забеспячэння, мы закранаем катэгорыю шматдзетных сем'яў і катэгорыю інвалідаў. Перш за ўсё, гэта зніжэнне патрабаванняў да стажу — агульнага і страхавога. Датычыцца інвалідаў I і II групы і шматдзетных сем'яў, якія выхоўваюць чацвёра дзяцей», — удакладніла Ірына Касцевіч.

Для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, таксама прапанаваныя меры па павышэнні пенсійных гарантый.

Ірына Касцевіч падкрэсліла, што прапановы выносіліся па рэальных сітуацыях з жыцця канкрэтных беларусаў, з якімі грамадзяне звярталіся на асабістыя прыёмы.

«Гэтыя праблемы нельга было ўбачыць пры падрыхтоўцы нарматыўна-прававых актаў раней, але жыццё паказала, што гэтыя адзінкавыя выпадкі — праблемныя і іх неабходна вырашаць. Менавіта гэты праект указа дазволіць асобным людзям вырашыць іх канкрэтныя жыццёвыя праблемы», — упэўнена кіраўнік ведамства.

Па словах Ірыны Касцевіч, нарэшце ўключана ў праект указа мера, якая неаднаразова абмяркоўвалася, — магчымасць правядзення адной спробы ЭКА на бязвыплатнай аснове за кошт дзяржавы.

Каментуючы сітуацыю на рынку працы, міністр пацвердзіла, назіраюцца асобныя негатыўныя моманты. «Перш за ўсё, ідзе скарачэнне колькасці вакансій. За апошні месяц (на 8 мая) колькасць вакансій скарацілася больш чым на трынаццаць тысяч. Павялічваецца і колькасць грамадзян, якія звяртаюцца ў службу занятасці па садзейнічанне ў працаўладкаванні», — удакладніла Ірына Касцевіч.

Але вакансіі ёсць, і іх 72 тысячы. Таму людзі, якія жадаюць знайсці работу, могуць гэта права рэалізаваць, падкрэсліла міністр.

«Канешне, стаіць задача захаваць працоўныя калектывы, і мы, бясспрэчна, будзем падтрымліваць перш за ўсё тых работадаўцаў, якія захоўваюць калектывы. Механізмы ёсць — няпоўная занятасць, прастой ці скарачэнне рабочага часу. Самае галоўнае, што чалавек усё роўна застаецца на гэтым прадпрыемстве з гарантаваным рабочым месцам», — адзначыла Ірына Касцевіч.

**Варвара МАРОЗАВА.**

## ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПАРАДКУ І ТЭРМІНАХ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ ДЛЯ ПРЫЗНАЧЭННЯ СТЫПЕНДЫЙ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТАЛЕНАВІТЫМ МАЛАДЫМ НАВУКОЎЦАМ НА 2021 ГОД

У мэтах стымулявання развіцця творчага патэнцыялу маладых навукоўцаў у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2005 года № 367 «Аб удасканаленні стымулявання творчай працы маладых вучоных» прызначаюцца 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам, якія працуюць у арганізацыях, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук (далей — стыпендыі). Названыя стыпендыі прызначаюцца на адзін каляндарны год і выплачваюцца незалежна ад памеру заработнай платы. Памер стыпендый вызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на падставе прапаноў Міжведамаснай камісіі па разглядзе кандыдатур для прызначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам па выніках штогадовага адкрытага рэспубліканскага конкурсу.

Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук — да 35 гадоў, вучоных без ступені — да 30 гадоў (на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне), што дасягнулі найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай, інавацыйнай дзейнасці.

Вылучэнне кандыдатур ажыццяўляецца арганізацыяй па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў.

Поўная інфармацыя аб парадку правядзення конкурсу, крытэрыях пры вылучэнні кандыдатур таленавітых маладых навукоўцаў, пераліку дакументаў, якія трэба прадставіць, размешчана на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — **http://gknt.gov.by**

Дакументы на конкурс для прызначэння стыпендый на 2021 год прадстаўляюцца да 1 ліпеня 2020 года ў:

Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, якія рэкамендаваны арганізацыямі акадэміі, на адрас: 220072, Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Тэлефон для даведак: (017) 284 24 56, 284 28 26;

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, якія рэкамендаваны ўстановамі вышэйшай адукацыі, на адрас: 220010, Мінск, вул. Савецкая, 9, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 200 99 80;

Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, якія рэкамендаваны іншымі арганізацыямі, што выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі, на адрас: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 379 25 20.

У выпадку парушэння тэрміну і формы прадстаўлення названых дакументаў або прадстаўлення іх не ў поўным аб'ёме хадайніцтвы арганізацый, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, да разгляду не прымаюцца!

Стыпендыі не прызначаюцца маладым вучоным, якім:

- у папярэднія пяць гадоў, уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне для ўдзелу ў конкурсе, прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам;
- на год прызначэння стыпендыі даюцца гранты ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.09.2013 г. № 425 «Аб грантах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у навуцы, адукацыі, ахове здароўя, культуры»;
- на працягу трох гадоў, якія папярэднічалі году прызначэння стыпендыі, прызначаліся іншыя стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за выключэннем стыпендый і грантаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, таленавітай моладзі.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «ИСПОЛНИ МЕЧТЫ ЭТОЙ ВЕСНОЙ ВМЕСТЕ С NESTLE И ВИТАЛЮР!»

Сведения об организаторе: Общество с ограниченной ответственностью «ПРОСПЕКТПРЕСС» (далее – Организатор), УНП 101520868.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Территория проведения рекламной игры: магазины «Виталюр», расположенные на территории Республики Беларусь.

Срок начала рекламной игры: 02 марта 2020 года.

Срок окончания рекламной игры: 15 мая 2020 года.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3754 от 24.02.2020 года, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 38 392 участника.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победители: полная информация о победителях Рекламной игры и их выигрышах опубликована по ссылке https://vitalur.by/NestleDreams/

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 (29) 322 42 52.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий комбинат хлебопродуктов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ КОМПЛЕКТА ОБОРУДОВАНИЯ ДЛЯ ВЫРАЩИВАНИЯ БРОЙЛЕРОВ

**производства Нидерланды компании VDL-Agrotech,**
**инв. № по бух. учету – 3405, год выпуска – 2011,**
**расположенного по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Копыльская, 57.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 109 400,00 бел. руб.** *Цена снижена на 20 %.*
Задаток 10 % от начальной цены – **10 940,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четыре) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 25.01.2020. Аукцион состоится **28.05.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.05.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.** УНП 600043883

УНП 700049385

## ОАО «Кожевник»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ 22.05.2020 в 09.00 на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов – torgi.gov.by» по продаже комплекса имущества: единый лот**

**(Капитальные строения, автотранспорт, оборудование, МБП)**
на сумму 3 808 487,88 белорусского рубля.

**Подробную информацию можно узнать по тел. (44) 7273733, (29) 6205849, на сайте https://bankrot.gov.by**

Блізкая ўлада

# РАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАДЫХОД

**Асвятленне вуліц, добраўпарадкаванне, капітальны рамонт — гэтыя і іншыя пытанні ўздымалі жыхары Брэсцкай вобласці падчас прамой лініі памочніка Прэзідэнта Анатоля МАРКЕВІЧА.**

Большасць зваротаў паступіла з абласнога цэнтра і райцэнтраў вобласці. Жыхары Баранавіч паскардзіліся на недастатковае асвятленне вуліцы. Ліхтар ёсць, але ён не гарыць. Агучаная праблема вырашылася адразу. Памочнік Прэзідэнта звязаўся з кіраўніцтвам адпаведнай службы і атрымаў запэўніванне, што недахоп будзе выпраўлены за дзень-другі.

Брастаўчанка Валянціна С. жыве ў сацыяльнай кватэры, і ў яе ўзнікла патрэба замены газавай пліты. Жанчына лічыць, што гэта павінен зрабіць уласнік кватэры. Анатоль Мечыслававіч даў даручэнне службовым асобам разабрацца з дагаворнымі ўзаемаадносінамі бакоў і вырашыць пытанне па законе.

Жыхароў дома па вуліцы Маскоўскай у Брэсце хвалюе пытанне капітальнага рамонту іх будынка. Ён будаваўся амаль паўвека, таму, акрамя ўнутраных работ, трэба прывесці ў парадак фасад. «Работа патрабуе рацыянальнага падыходу, — сказаў Анатоль Маркевіч. — Можна затраціць сродкі, правесці касметычны рамонт, які не дасць патрэбных вынікаў і не палепшыць якасць жыцця для кватэранаймальнікаў. Тут неабходна знайсці спосаб разумнага і рацыянальнага ўкладання сродкаў».

Актыўнасць падчас прамой лініі праявілі таксама жыхары Баранавіцкага, Лунінецкага, Ляхавіцкага, Іванаўскага раёнаў. Усяго падчас прамой лініі памочнік Прэзідэнта даў адказы на 11 пытанняў.

**Яна СВЕТАВА.**

# УВАЖЛІВА І ЎЗВАЖАНА

**Сям'я пагарэльцаў прасіла дапамагчы з жыллём, жыхары прыватнага сектара цікавіліся магчымасцю пракласці каналізацыю ў крэдыт, прадпрымальнік звярнуўся з просьбай перагледзець тэрміны ўвядзення ў эксплуатацыю набытага ім будынка... З гэтымі і іншымі пытаннямі жыхары Гомельшчыны звярнуліся да памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя ШУЛЕЙКІ.**

Прамую тэлефонную лінію памочнік Прэзідэнта правёў у Гомельскім аблвыканкаме. На сувязь выйшлі 28 абанентаў — жыхароў розных куткоў рэгіёна. Асноўная праблематыка зваротаў — жыллё і камунальна-бытавыя ўмовы.

Так, жыхар Акцябрскага раёна тлумачыў, што хоча мець электракацёл у доме, але сутыкнуўся з нюансамі ўстаноўкі прылады і прасіў паспрыяць у атрыманні дазволу на яе. Выслухаўшы зварот, Юрый Шулейка рэкамендуе чалавеку звярнуцца да раённых уладаў, каб падрабязней разабрацца ў становішчы ў тэхнічным плане.

На «гарачую» лінію звярнулася жыхарка Светлагорскага раёна. Яна ў роспачы: летась у яе сям'і згарэў дом:

— Усё згарэла дашчэнту. На шчасце, усе жывыя і цэлыя, аднак стаіць пытанне наконт жылля. Да таго ж па рашэнні суда ўсе паўналетнія члены сям'і павінны выплачваць сур'ёзную суму нанесенай шкоды суседзям. З зарплаты ўтрымліваюць 50 %.

Памочнік Прэзідэнта паабяцаў, што ў праблему сям'і ўнікнуць і разгледзяць магчымыя варыянты дапамогі.

Гамяльчанка, якая жыве на апошнім паверсе аднаго з домоў па вуліцы Чкалава, скардзілася на працяканне даху пяціпавярховіка. Казала, што не толькі яна пакутуе ад гэтай праблемы. Маўляў, звярталіся ў ЖЭУ, але сітуацыя не мяняецца. Пасля аповеду гамяльчанкі Юрый Шулейка запэўніў, што на яе адрас выйдуць спецыялісты ЖКГ, каб ва ўсім разабрацца.

Прадпрымальнік звярнуўся на «гарачую» лінію з просьбай адтэрмінаваць увод у эксплуатацыю набытага ім будынка. Мужчына растлумачыў, што набыў маёмасць плошчай больш за дзве тысячы квадратных метраў. Адрамантаваў будынак напалову. Але па стане здароўя не змог скончыць рамонтныя работы і ў адведзены тэрмін увесці памяшканне ў эксплуатацыю. Выходзіць, што парушае закон, але абяцае выправіць сітуацыю. Пытанне з будынкам прадпрымальніка трэба вывучыць і ў хуткім часе даць чалавеку адказ, дае даручэнне Юрый Шулейка.

Падводзячы вынікі прамой лініі, інспектар па Гомельскай вобласці адзначыў, што ў асноўным людзі звярталіся з бытавымі пытаннямі:

— Гэта жыццёвыя тэмы — пытанні энерга- і газазабеспячэння, абрання старшыні жыллёва-будаўнічага кааператыва... Усе яны зразумелыя, людзі хочуць добраўпарадкаваць прастору вакол сябе. І ў гэтым плане знаходзяць разуменне з боку ўладаў.

Напрыклад, паступіў і такі зварот: гамяльчане — жыхары вуліц прыватнага сектара ўдзельнічаюць у долевым будаўніцтве каналізацыі. Улады падтрымалі гэтую ініцыятыву. Аднак цяпер гараджане сутыкнуліся з недахопам сродкаў. Яны цікавіліся, ці можна на гэтыя мэты выкарыстаць банкаўскае крэдытаванне.

— Гэтае пытанне трэба ўдакладніць, разабрацца і абавязкова ўсё растлумачыць жыхарам, — кажа Юрый Шулейка і зазначае, што ўлады на месцах павінны дэталёва ўнікаць у сітуацыі людзей і даваць узважаныя даручэнні адказным службам.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# АЭС рыхтуецца да пуску ў ліпені

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак, пакуль не будзе ўпэўненасці ў гатоўнасці да пуску персаналу і абсталявання, фізічнага запуску станцыі не будзе. Беларусы больш за сваіх краін-суседзяў зацікаўлены ў бяспецы, бо перажылі Чарнобыль, запэўніў намеснік міністра.

### Кошт кілават-гадзіны

*— Ядзернае паліва на станцыі цяпер праходзіць уваходны кантроль. З моманту загрузкі першай касеты пачынаецца этап фізічнага пуску рэактара. Паліва дастаўлена ў межах агульнага генкантракта на ўзвядзенне Беларускай АЭС. У цыкле атамных станцый у цэлым ядзернае паліва ў сабекошце выпрацоўкі электраэнергіі з улікам яго наступнага выкарыстання, то-бок перапрацоўкі і захоўвання адпрацаванага рэчыва, займае каля 20 %,* — удакладніў Міхаіл Міхадзюк. — *Што датычыцца класічных станцый на арганічным паліве, то яго сабекошт у выпрацоўцы энергіі ў залежнасці ад тыпу станцыі вагаецца ад 60 да 70 %, а то і вышэй.*

На сабекошт выпрацоўкі электраэнергіі ўплывае шмат фактараў, перш за ўсё цана на прыродны газ. Сёння ў энергасістэме праводзіцца вялікая і сістэмная работа па зніжэнні выдаткаў на вытворчасць кожнай кілават-гадзіны. Да ўсіх энергазабеспячальных арганізацый даведзены адпаведныя заданні, якія жорстка кантралююцца. Цяпер сабекошт 1 кВт/г каля 16 капеек. Спецыяльнай міжведамаснай камісіяй адпрацоўваюцца фактары, якія будуць уплываць на кошт энергіі, выпрацоўваемай на АЭС, дадаў эксперт.

### Персанал з вопытам

Поўнасцю набраны і падрыхтаваны персанал, які атрымаў адпаведныя ліцэнзіі ад рэгулятара для работы на першым энергаблоку. Амаль завершаны набор персаналу для другога блока, вядзецца яго падрыхтоўка. На станцыі ўжо працуюць 316 спецыялістаў — выпускнікоў айчынных ВНУ, якія адвучыліся па профілі і прайшлі стажыроўку на расійскіх станцыях.

*— Для падрыхтоўкі персаналу мы працавалі ў розных кірунках. Запрасілі замежных спецыялістаў, перш за ўсё расійскіх і ўкраінскіх экспертаў з вопытам работы на атамных станцыях. Яны занялі пасады галоўнага інжынера і яго намеснікаў, начальнікаў асноўных цэхаў, найперш рэактарнага. Такія спецыялісты ёсць у кожнай аператыўнай схеме на станцыі. Трэба, каб у кожнай змене быў чалавек, які мае вопыт,* — расказаў Міхаіл Міхадзюк. — *Нашы спецыялісты прайшлі падрыхтоўку ў вучэбных расійскіх цэнтрах і айчынным вучэбна-трэніровачным цэнтры. Стажыроўка ў нашым цэнтры — працэс бесперарыўны. Асноўная група спецыялістаў, якіх мы запрасілі на работу, — людзі з базавай энергетычнай адукацыяй, якія прайшлі адпаведную перападрыхтоўку ў расійскіх ВНУ і стажыроўку на станцыях. Запрасілі на работу і спецыялістаў, якія прайшлі навучанне ў межах дзяржпраграмы падрыхтоўкі кадраў для ядзернай энергетыкі Рэспублікі Беларусь.*

### Ліцэнзія на эксплуатацыю

Дзяржатамнагляд як рэгулюючы орган удзельнічае ва ўсіх работах на атамнай станцыі. Ён таксама займаецца разглядам дакументаў аб бяспецы на АЭС і рыхтуецца да атрымання экспертнага заключэння ад Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў Сосны. Да 29 мая па тэхзаданні Дзяржатамнагляду інстытут павінен даць канчатковае заключэнне, якое дазволіць прыняць рашэнне аб адпаведнасці станцыі ўсім патрабаванням, паведаміла **Вольга ЛУГОЎСКАЯ, начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (Дзяржатамнагляд).**

Перад выдачай ліцэнзіі з дазволам на запуск першага энергаблока станцыі павінны прайсці грамадскія слуханні, якія і лягуць у аснову рашэння аб выдачы дакумента. Фармат іх правядзення — гэта фактычна сход, які павінны адбыцца ў найбліжэйшым да станцыі населеным пункце. Гэта, зразумела, Астравец. Аднак неабходна арыентавацца на эпідэміялагічную сітуацыю, якая створыцца на момант пачатку слуханняў.

*— Слуханні будуць праведзены не менш як за тыдзень да прыняцця калегіяй МНС рашэння па выдачы ліцэнзіі,* — падкрэсліла Вольга Лугоўская. — *А за пяць дзён да гэтага матэрыялы будуць змешчаны на сайце Дзяржатамнагляду для азнаямлення грамадскасці. Пакуль дакладная дата слуханняў не вызначана. Мы ў працэсе падрыхтоўкі рашэнняў у межах ліцэнзійнага працэсу. Будзе таксама праведзена мэтавая праверка бліжэй да моманту прыняцця рашэння, не раней чым у канцы чэрвеня.*

**Ірына СІДАРОК.**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 28.05.2020 повторного аукциона по продаже комплекса недвижимости

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 700/С-49731 – Здание административно-бытового корпуса (РСЦ) подсобного хозяйства**, площадь – 622,7 кв. м, адрес: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75387 – Здание КПП**, площадь – 13,0 кв. м, по адрес: г. Могилев, пр-т Шмидта, 47. **Капитальное строение с инв. № 700/С-75386 – Здание мастерской с компрессорной**, площадь – 172,0 кв. м, г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-49604 – Здание столярного цеха**, площадь – 1455,0 кв. м, г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. Вышеуказанные капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000005002618 (площадь 1,8398 га, право постоянного пользования). **Капитальное строение с инв. № 700/С-49719 – Овощная база**, площадь – 1324,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005001828 (площадь 221,7270 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. **Капитальное строение с инв. № 700/С-105889 – Асфальтобетонное покрытие,** площадь – 1996,5 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005001828 (площадь 221,7270 га, право постоянного пользования) по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, территория ОАО «Могилевхимволокно». **Тепловые сети** от магистрали к зданиям АБК(РСЦ) подсобного хозяйства, столярного цеха и КПП (сельхозцех), инв. № 3010120400. **Канализационная сеть** от магистрали I очередь к зданиям АБК(РСЦ) подсобного хозяйства, столярного цеха и КПП (схц), инв. № 3010120600. **Счетчик жидкости и количества теплоты** СНТ2 ДУ32, инв. № 4701451600. **Забор металлический**, инв. № 2030069500.

**Начальная цена продажи: 590 832,50 бел. руб. с учетом НДС**
**Сумма задатка: 59 083,25 бел. руб.**

**Аукцион состоится 28 мая 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений: по 27.05.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевхимволокно», УНП 700117487, Могилевская обл., г. Могилев-35, 8-0222-499-047

**Расчетный счет для внесения задатка:**
Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 0,5 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 20 (двадцать) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 11.06.2019, 15.02.2020

Организатор аукциона:
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,**
УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.
Доп. информацию можно получить по тел.:
**+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

## ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

(220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А, комн. 327, тел. 8 (017) 398-20-40, www.integral.by)

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОДАЖЕ Б/У ОБОРУДОВАНИЯ:**

| Наименование | Стоимость с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|
| 1. Пресс-ножницы комбинированные НВ5222Б01, б/у, 1990 г. вып., инв. № 02255 | 2 496,00 |
| 2. Станок токарно-винторезный ИЖ-1И611П, б/у, 1976 г. вып., инв. № 56367 | 2 616,00 |
| 3. Станок вертикальный 6Т-13-1, б/у, 1988 г. вып., инв. № 93303 | 6 936,00 |
| 4. Универсальный фрезерный станок 6Т-80, б/у, 1989 г. вып., инв. № 96428 | 2 196,00 |
| 5. Токарно-револьверный станок УТ16ПМ, б/у, 1987 г. вып., инв. № 88925 | 4 068,00 |
| 6. Пресс И1020, б/у 1990 г. вып., инв. № 01449 | 3 120,00 |
| 7. Вертикально-фрезерный станок ВМ-127, б/у, 1982 г. вып., инв. № 67237 | 9 516,00 |
| 8. Вертикально-сверлильный станок 2Н125Л, б/у, 1983 г. вып., инв. № 68801 | 1 236,00 |

Указанная стоимость действует до 25.05.2020 г., условия оплаты – предоплата 100 % стоимости оборудования.

**Полный перечень оборудования, подлежащего отчуждению путем прямой продажи, размещен на сайте www.integral.by (раздел «О КОМПАНИИ/Реализация б/у оборудования»).**

Контактное лицо: Сак Ольга Валерьяновна, тел.: 8 (029) 751-10-00, 8 (017) 398-65-47, e-mail: osak@integral.by. УНП 100386629

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** | | |
| **Продавец** | **ОАО «Сморгоньагросервис», ул. Тракторная, 64, 231000, г. Сморгонь** | | |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** | | |
| **Предмет электронных торгов, реализуемый одним лотом, в следующем составе:** | | | |
| **Наименование (назначение)** | | **Общ. пл.** | **Инв. номер** |
| **Заправочная** (Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | | 36,8 кв. м | 443/С-13394 |
| Составные части и принадлежности: ворота (а), ограждение (б), ограждение (в) Адрес: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Молодежная, 3Ж | | | |
| **Склад** (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | | 107,2 кв. м | 443/С-22221 |
| Составные части и принадлежности: покрытие (г). Адрес: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Молодежная, 3Ж/1 | | | |
| **Гаражи** (Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | | 175,5 кв. м | 443/С-22223 |
| Составные части и принадлежности: дощатая уборная (1), асфальтобетонное покрытие (д). Адрес: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Молодежная, 3Ж/2 | | | |
| **Заправочная маслом** (Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | | 40,8 кв. м | 443/С-22224 |
| Адрес: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Молодежная, 3Ж/3 | | | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. 0,6968 га предоставлен на праве аренды по 12.11.2069 г. для обслуживания заправочной станции, заправочной маслом, гаражей и склада | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **29 340,00 белорусских рублей** | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Срок подписания (заключения) договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после электронных торгов | | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | | | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 дней после проведения электронных торгов | | | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | | | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов Начало торгов – 10.00 16.06.2020 г. Окончание торгов – 11.00 16.06.2020 г.** Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов | | | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.06.2020 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by** | | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** | | |

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим ВОРОНИНА Бориса Васильевича 06 ноября 1955 года рождения, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская обл., г. Речица, ул. Речная, д. 18. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Воронине Борисе Васильевиче.

## КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ проводит 15 июня 2020 года открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Каменский с/с, д. Чмелевичи, 39А, земельный участок с кадастровым номером 623282713601000043, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 1 200 | Публикация в газете + 1 819,31 бел. рубля | 240 |

Задаток в размере 20 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № BY42AKBB36006190711030000000 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойска, БИК банка AKBBBY2X, УНН 600181630, УНП 600537220, ОКПО 044315476, код платежа 4901.

Аукцион состоится **15 июня 2020 года в 11.00** по адресу: Минская область, Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00, 1-я и 3-я суббота месяца – с 9.00 до 12.00 по адресу: Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, д. 7А. Последний день приема заявлений – **09 июня 2020 года до 17.00**. Контактные телефоны: **(801774) 72335, 72381, 72343.** Наш сайт в интернете: **logoysk.gov.by**

Дабрачыннасць

# «Шчыры абед» ад шчырага сэрца

## У Мінску валанцёры дастаўляюць гарачыя стравы для ўразлівых катэгорый грамадзян

**Пажылыя адзінокія людзі, былыя вязні канцэнтрацыйных лагераў, ахвяры вайны заўсёды мелі патрэбу ў клопаце і падтрымцы. Асабліва актуальнай стала апека над імі цяпер, падчас пандэміі каранавіруса. Зразумела, што найчасцей — гэта людзі з мноствам хранічных захворванняў, якім небяспечна выходзіць на вуліцу, у краму, аптэку. На дапамогу ім прыйшлі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, розных фондаў, валанцёры.**



У прыватнасці, 1 мая стартавала і будзе дзейнічаць на працягу трох месяцаў праграма падтрымкі «Шчыры абед». У яе межах бясплатнае гарачае харчаванне атрымліваюць найбольш уразлівыя грамадзяне, якія жывуць у сталіцы. Праграма накіравана на падтрымку падчас пандэміі COVID-19 пажылых людзей, што маюць у гэтым патрэбу. У першую чаргу — гэта сведкі ваенных падзей, сярод якіх былыя вязні нацызму; людзі, якія былі вывезены ў Германію на прымусовыя работы; дзеці вайны і праведнікі міру.

Праграму рэалізуюць Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханеса Рау (IBB Minsk), гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна сумесна з Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа пры фінансавай падтрымцы Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра і нямецкай дабрачыннай каталіцкай арганізацыі «Рэнавабіс».

— У сваіх адукацыйных праграмах IBB Minsk працуе з сацыяльна ўразлівымі групамі, у тым ліку са сведкамі ваенных падзей, а ў сітуацыі распаўсюджання каранавіруса яны знаходзяцца ў асаблівай групе рызыкі. Такім чынам мы выказваем удзячнасць і падтрымку ўсім, хто пацярпеў ад ваенных злачынстваў, — расказаў пры сустрэчы **ўдзельнік праекта і эксперт па ўстойлівым развіцці ў IBB Minsk Ларс ШМІТ.** — На жаль мы не можам дапамагчы ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу, паколькі абмежаваныя ў фінансавых і людскіх рэсурсах. Пакуль мы дастаўляем гарачыя абеды 35 пажылым людзям, але праз месяц плануем павялічыць колькасць адрасатаў удвая. Мы вельмі ўдзячныя калегам з Беларускага Чырвонага Крыжа, якія забяспечылі праект валанцёрамі.

— Рэстаран «Вестфалія» (IBB Minsk) гатуе комплекс гарачых абедаў на два дні. Дастаўляюць іх валанцёры тры разы на тыдзень на працягу трох месяцаў бескантактна. Валанцёры праходзяць у Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа анлайн-інструктаж па мерах бяспекі ў перыяд пандэміі, ім выдаюцца індывідуальныя сродкі аховы: маскі, пальчаткі, дэзынфікуючыя сродкі. Валанцёры дастаўляюць абеды пешшу або на сваім транспарце па Маскоўскім раёне сталіцы. Таксама з дапамогай сэрвісу «Яндэкс. Таксі» давязуць валанцёраў, якія не маюць асабістага транспарту, да патрэбнага адрасата. Разам з абедам пажылыя людзі атрымліваюць памятку-інструкцыю аб бескантактнай дастаўцы і брашуру па прафілактыцы і ахове ад COVID-19 ад Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа.

— Да Дня Перамогі кухары дадаткова для нашых падапечных прыгатавалі дэсерт, які прыдумалі самі. Акрамя таго, мы павіншавалі іх паштоўкамі, кветкамі, — кажа **Анастасія РЫЖАНКОВА, спецыяліст па сувязях з грамадскасцю ММАЦ.**

Пакуль мы гутарылі з Анастасіяй, работнікі «Вестфаліі» прыгатавалі абеды.

Дарэчы, збалансаванае меню кожны тыдзень мяняецца. Работнікі кухні, зыходзячы з магчымасцяў, імкнуцца, каб яно было разнастайнае: сёння, напрыклад, рыба, заўтра — курыныя катлеты.

А вось і валанцёры пачалі збірацца. Яны выносяць стравы, упакаваныя ў кантэйнеры і спецыяльныя пакеты, змяшчаюць у каробкі. Мы з фотакарэспандэнтам звяртаем увагу на спрытную стройную дзяўчыну. Гэта Віялета Марэцкая. Цікавімся, якім чынам яна трапіла ў валанцёры.

— Я вучуся завочна ў клінічнай ардынатуры дзіцячага хірургічнага цэнтра па спецыяльнасці «дзіцячая хірургія». Таму ёсць вольны час. Пра Чырвоны Крыж я ведала раней, гэта — вядомая арганізацыя, вядзе шмат праектаў, таму запоўніла картку валанцёра. Свой першы маршрут прайшла пешшу, бо мае падапечныя жывуць тут непадалёк. Сёння ўбачу іх трэці раз. Яны ўсе дзякуюць за клопат. А адна жанчына нават сказала, што ніколі так смачна не ела. І пажартавала, што хутка ў штаны не ўлезе.

Разам з Віялетай працуе Дзмітрый Пярэдрый на сваім аўтамабілі. Хлопец — будаўнік. На пытанне, што яго прымусіла стаць валанцёрам, адказаў коратка: «Любоў да людзей, калісьці прыняў рашэнне любіць бліжняга».

Звонім у кватэру аднаго з дамоў па праспекце Газеты «Праўда». Надзяваем маскі, дэзынфікуем рукі, узнімаемся на патрэбны паверх. Дзмітрый і Віялета ставяць каля ўваходных дзвярэй зэдлік, куды змяшчаюць абед, і адыходзяць на бяспечную адлегласць.

— Добра, паверу вам. Паедзем.

Сустрэча адбылася ў Доме літаратара і доўжылася больш за гадзіну. Аб чым была размова — не ведаю, я аб гэтым Быкава не пытаўся. Але размовай ён, здаецца, застаўся задаволены.

* * *

Хемінгуэй аднойчы сказаў, што найлепшая школа для пісьменніка — нешчаслівае дзяцінства.

А Твардоўскі прыбавіў сюды яшчэ і юнацтва. У гэтым плане Быкаву «пашанцавала». Як ён сам прызнаваўся:

*— У мяне не было шчаслівага дзяцінства. І таму ўспаміны аб ім радасці мне не прыносяць... Прыпала яно на цяжкія трыццатыя гады — жахлівыя ў сацыяльных і палітычных адносінах. Голад, бяспраўе. Канешне, дзеці не перажывалі ў поўнай меры таго, што давялося на долю бацькоў. Але гэтая атмасфера ўздзейнічала на дзіцячую псіхалогію, якая фарміравалася. І мая эмацыянальная памяць захавала шмат смутку... Што датычыцца наступных гадоў, то яны былі яшчэ горшыя.*

Летам 1941 года пасля сканчэння школы ФЗН (фабрычна-заводскага навучання) Быкава, які атрымаў спецыяльнасць муляра, накіравалі на работу ў горад Шостка Чарнігаўскай вобласці. Там яго і заспела вайна. Усё, што ён перажыў у гады ваеннага ліхалецця, падрабязна апісана ў ягонай кнізе «Доўгая дарога дадому». Пераказваць не мае сэнсу. Хачу толькі зазначыць: двойчы Васіль Уладзіміравіч быў на мяжы жыцця і смерці.

Першы раз, калі ён, адстаўшы ад калоны маладых хлопцаў, якіх мабілізавалі ў ваенкамаце і накіравалі ў тыл, зайшоў у нейкі недабудаваны дом і ў знямозе прылёг у куце. І вось як пра гэта ўспамінаў Васіль Уладзіміравіч:

*«Здаецца, толькі задрамаў, як нехта засвяціў у вочы ліхтарыкам. Аказалася, што вайсковы патруль. Мяне забралі ў камендатуру. Там абшукалі, адабралі ўсе дакументы, небагатыя мае рэчы ў палявой кірзавай сумцы. Асабліва падазрэнне выклікаў невялікі аркуш геаграфічнай карты, выдраны мною з падручніка ў нейкай школе. На той карце я адзначаў лінію фронту паводле паведамлення ТАСС. Крыклівы старшы лейтэнант у сіняй фуражцы НКВД патрабаваў прызнацца, якое і ад каго я атрымаў заданне. Я бажыўся, што адстаў ад калоны, але ён не хацеў і слухаць. Што я затрыманы шпіён — сведчыла тая карта».*

Недарэчнае здарэнне магло скончыцца трагічна. Затрыманых у камендатуры аказалася некалькі чалавек. Раніцаю іх пачалі выводзіць па двое. Назад ніхто не вяртаўся. Страх ахапіў Быкава: гэтак недарэчна загінуць. І зноў-такі лепш за ўсё даць слова самому пісьменніку:

*«Нас вывелі за камендатуру на агарод. Тут буяла бульбянішча, былі нейкія грады. А далей — стары паламаны плот і чужы суседскі садок. Зразумеўшы, што нас чакае, я не стрымаўся, слёзы самі лінулі з вачэй. Майго суседа тут жа белабрысы зваліў стрэлам у патыліцу і вярнуўся ў камендатуру за вугал. А мой канваір нешта марудзіў. Запытаў толькі: «Адкуль будзеш?» — «З Беларусі», — сказаў я праз слёзы і пачуў ціхае: «Бяжы! Туды!» Я кінуўся цераз бульбу, да блізкага плоту, і, як ужо пераляцеў праз яго, ззаду бухнуў стрэл. Угару».*

Другі раз смерць падсцерагала малодшага лейтэнанта, камандзіра другога стралковага ўзвода Васіля Быкава на дняпроўскіх плацдармах зімою 1943 года. Каля нейкага сяла, на ўскрайку кукурузнага поля, усчаўся шалёны бой. Быкава раніла ў нагу. *«Ну, усё, падумаў я, лежачы на снезе. Калі куля перабіла косці, дык я тут і застануся. Каб дазнацца аб тым, паспрабаваў ускочыць — не, нага не падламілася.*

*Тое, што я ўскочыў, мусіць, было нечакана для нямецкага танкіста, і ён павярнуў танк на мяне. Укленчыўшы, я накіраваў сваю кумулятыўную гранату і шпурнуў у танк. Здаецца, аднак, граната не ўзарвалася, ці я прамахнуўся. І ў той жа момант ледзьве выкруціўся з-пад танкавай гусеніцы, тракі якой праехалі па полах майго шыняля. Мяне засыпала снегам, я схапіўся за аўтамат, але, выцягнуўшы яго са снегу, не мог узвесці затвор, магазін звернуты ўбок і раструшчаны. Немцы тым часам былі ўжо блізка і крычалі: «Рус, здавайся!»*

*Танк, які ледзьве не раздушыў мяне, быў, можа, у метрах пяцідзесяці наперадзе, і тады там узнікла імклівая постаць, яна размахнулася — і на брані танка выбухнула...»*

Быкаў апынуўся ў санчасці, пад якую прыстасавалі звычайную сельскую хату. Але неўзабаве ў сяло ўвайшлі нямецкія танкі. Параненыя паразбягаліся, засталіся толькі тыя, што не маглі хадзіць. У Быкава за ноч нага распухла так, што ён не мог ужо і ступіць. Аднак і заставацца ў хаце было нельга. З цяжкасцю ён выпаўз на дарогу. На шчасце, ехала спадарожная фурманка, якая і падабрала яго.

Васіль Уладзіміравіч успамінае: *«Я аберуч трымаюся за нешта ў фурманцы і гляджу назад, на сяло. Ля царквы бачу нашу санчасць у няхуцавай мазанцы. Адзін танк раптам спыняецца і з вуліцы двума стрэламі б'е па хаціне, тая знікае ў воблаку пылу. І ўсё. Мабыць, тыя, што там заставаліся, абстралялі яго ці кінулі гранату, во танк і расправіўся з імі. Па ўсёй верагоднасці, тое ж назіраў аднекуль і мой камбат, які заходзіў перад тым, як пайсці збіраць батальён. Дык ён, канешне, рашыў, што там застаўся і Быкаў. Так мяне спісалі з ліку жывых, бо ў той полк я больш не вярнуўся».*

* * *

Васіль Быкаў у літаратуры дэбютаваў даволі позна — у трыццаць два гады. Але вельмі імкліва набываў вядомасць і папулярнасць. Яго сапраўдны ўзлёт як пісьменніка пачаўся з аповесцяў «Жураўліны крык» і «Трэцяя ракета». Абедзьве былі надрукаваны ў «Маладосці».

Васіль Уладзіміравіч пазней успамінаў пра гэта з відавочнай прыемнасцю: *«Галоўны рэдактар Пімен Панчанка сказаў мне з гэтага поваду трохі ласкавых слоў. Яны, вядома ж, узнімалі настрой, дадавалі жадання пісаць і яшчэ. На нейкай нарадзе да мяне падышоў малады навуковец і пачынаючы празаік Алесь Адамовіч, які павіншаваў з праўдай вайны, што з'явілася на старонках і беларускага друку. Я быў удзячны абодвум. У краіне паяўлялася новая літаратура з новым бачаннем свету і, у прыватнасці, мінулай вайны. Галоўнай ідэйна-мастацкай адметнасцю гэтай літаратуры стала прызнанне наяўнасці на вайне не толькі знешняга, так бы мовіць, ворага — нямецкага фашыста, але і кагосьці унутранага, мала за немца лепшага. Раней гэта быў проста здраднік, часам трус, дэзерцір. Цяпер стаў яшчэ і перастрахоўшчык, кар'ерыст, эгаіст».*

Вось чаму шлях В. Быкава на літаратурны Алімп не быў, вобразна кажучы, усланы ружамі. Ружы, канешне, былі, але хапала і шыпоў. Тая новая літаратара, якая нараджалася ў 60–70-я гады мінулага стагоддзя, вымагала ад пісьменніка не толькі таленту, выключнай шчырасці і сумленнасці, але і мужнасці.

Пачынаючы кожны новы твор, Быкаў практычна ішоў па цаліку, выдатна разумеючы, што ён закранае балючыя тэмы і выкліча, калі ўжыць вайсковую тэрміналогію, агонь на сябе. І так яно, як правіла, і было.

І на працягу многіх гадоў Васіль Быкаў не пераставаў даводзіць — і ў мастацкіх творах, і ў публіцыстыцы, і ў публічных выступленнях — сваё святое права як пісьменніка гаварыць пра вайну ўсю праўду, якой бы горкай яна ні была.

* * *

У гады перабудовы так званыя ліберальна-дэмакратычныя сілы ўсяляк імкнуліся далучыць Васіля Быкава да сваіх палітычных гульняў, даючы яму азначэнні «апостал праўды», «сумленне нацыі» і таму падобнае. Пісьменнік адносіўся да гэтага даволі цвяроза і нават крытычна: *«Я не лідар і не «сумленне нацыі», я просты, біты жыццём беларус, які мае толькі адну мэту — застацца сумленным...»*

Пасля некалькіх гадоў жыцця за мяжой Васіль Быкаў вярнуўся на радзіму. Вярнуўся, праўда, з сумнай нагоды. Аперацыя, якую яму зрабілі ў Чэхіі, прайшла не зусім удала. Страшную хваробу, што закралася ў вантробы, да канца перамагчы не ўдалося.

Васіля Уладзіміравіча паклалі ў Бараўляны. Да нашых спецыялістаў, якія, трэба аддаць ім належнае, маюць у гэтай справе немалы вопыт. Дай жа, Божа, нашаму слыннаму пісьменніку поўнага выздараўлення!

На жаль, цуду не адбылося. Васіль Быкаў памёр. Вечарам 22 чэрвеня. Ёсць у гэтым нейкі містычны знак: чалавек, які ўсё сваё жыццё пісаў пра вайну, пайшоў з жыцця ў дзень, калі гэта вайна пачалася.

Што тут скажаш? Шкада, бясконца шкада, што перастала біцца сэрца вялікага пісьменніка Беларусі. У тым, што гэта сапраўды вялікі талент, не сумняваецца, думаю, ніхто.

Непрыемна, прыкра, што тут жа пачаліся розныя палітычныя спекуляцыі. Усе тры маскоўскія тэлеканалы, напрыклад, заявілі, што Быкава пераследавала Савецкая ўлада, нясоладка яму жылося і пры цяперашнім ладзе.

Што ж, пэўным сілам абавязкова трэба зрабіць з Быкава пажыццёвую ахвяру — ні пісаць, ні жыць, ні дыхаць яму тут, бачыце, не давалі. Аднак жа ўсе творы публікаваліся ў беларускім перыядычным друку і амаль паралельна выходзілі ў Маскве. Усе (за выключэннем «Мёртвым не баліць») выдаваліся асобнымі кнігамі вялікімі тыражамі.

Так што не трэба рабіць з Васіля Быкава пакутніка, а тым больш рэвалюцыянера. Найперш ён — пісьменнік, і тым увойдзе ў вечнасць.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

# СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ АДНОСІН

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Гэтае рашэнне далося ёй нялёгка, нават родная маці адгаворвала. У самой Алены здароўе, мякка кажучы, вымушае жадаць лепшага. Некалі ў зусім маладой пасля першых родаў адняліся ногі. Дзе толькі не лячылася, істотнага паляпшэння не наступала. І тады адна з доктарак падказала, што трэба нарадзіць яшчэ, маўляў, бывалі выпадкі. І праўда, пасля другіх родаў нібы само сабой усё стала на месца. Літаральна праз некалькі гадзін Алена змагла ўстаць. Выходзіць, што малодшы сын выратаваў яе самую, узняў на ногі. Дык хіба яна не здолее зрабіць усё, каб яго выратаваць? — разважала тады.

Саша з самага дзяцінства быў хваравіты, нават у школу не хадзіў, быў на надомным навучанні, пазней праявілася невялікае адставанне ў развіцці. З гадамі стала развівацца сур'ёзная паталогія нырак. Але яны з мужам Уладзімірам разам пераадольвалі ўсе выпрабаванні лёсу. Дабудоўвалі і добраўпарадкавалі дом, які выдзеліла сельгаспрадпрыемства, трымалі падсобную гаспадарку, вялікі агарод, каб хапала і на дзяцей, і на ўладкаванне дома. Вядома, калі б Уладзімір быў жывы, ёй прыйшлося б нашмат лягчэй пасля аперацыі. Сама без ныркі, слабая, даглядала сына, які праходзіў доўгую рэабілітацыю. Але ж дзесяць гадоў таму муж памёр ад пухліны галаўнога мозга. Літаральна згарэў за кароткі прамежак часу. І вось гэта было адным з галоўных аргументаў тых, хто адгаворваў: «Ты адна не справішся з такім цяжарам». Але яна справілася.

Ёй і дактары не давалі ніякай гарантыі. У яе чацвёртая група крыві са станоўчым рэзусам, у яго трэцяя — з адмоўным. Пры такім раскладзе рызыка ўзрастае шматразова. Яе папярэджвалі, што нырка можа не прыжыцца, тады яе давядзецца выдаліць, і яе ахвяра становіцца марнай. Але яна прыняла рашэнне... Аперацыю зрабілі роўна сем гадоў таму. Алена Клімовіч вельмі ўдзячная дактарам, сёстрам, малодшаму персаналу Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак пры 9-й клінічнай бальніцы. Яна лічыць, што пацыентам дапамагаюць не толькі тэхналогіі, прэпараты, самі найскладанейшыя аперацыі, але і добразычлівасць, спагада. Нездарма ж потым у сваёй царкве яна заказала малебен за здароўе ўсіх медыкаў брыгады, якая рабіла абедзве аперацыі.

Пасля аперацыі ёй давялося на некаторы час пакінуць работу, бо Сашу патрабаваўся догляд. Строгія дыеты, таблеткі па 50 і болей за дзень строга па часе. Дадаць сюды пастаянныя паездкі ў Брэст і Мінск да дактароў. Як усё гэта перажыла, асіліла, яна потым і сама растлумачыць не магла. Проста рабіла ўсё, што трэба. Тады яна не раз чула ад сяброў, знаёмых на свой адрас: «Моцная жанчына». Горка ўсміхалася, адказвала, што моцнай яе зрабілі гора, слёзы і безвыходнасць.

Паступова ўсё ў іх наладзілася. Саша падлячыўся, Алена выйшла на работу на мэблевую фабрыку. Падрастаюць унукі ў сям'і старэйшага сына. А яна аптыміст па жыцці, шмат усміхаецца, кажа, што ўсё ў іх будзе добра. Відавочна, што крыніца яе сілы і моцы хаваецца ў яе мацярынскай душы.

## ПАКІНУЦЬ ДЗІЦЯ Ў СЯМ'І

У той жа год, як з Аленай, мне давялося пазнаёміцца яшчэ з адной маці — Ганнай Бахур. Там іншая гісторыя, якая моцна нашумела тады ў краіне. Ганна — інвалід першай групы, муж — таксама інвалід першай групы. На гэтай падставе яшчэ ў радзільным доме маладой маці паведамілі, што яны з мужам не могуць выконваць бацькоўскіх абавязкаў і дзіця ў іх забіраюць. Хлопчыка збіраліся накіроўваць у адпаведную дзіцячую ўстанову, потым — уладкоўваць у прыёмную сям'ю ці сямейны дзіцячы дом. І Аня не змірылася, яна стала біць ва ўсе званы...

У самой Ганны прыроджаная анамалія канечнасцяў, яна нарадзілася без кісцяў рук, з кароткімі нагамі, крыху недаразвітымі ступнямі. Але са сваім калецтвам Аня даўно навучылася жыць. Яна ўсё робіць па гаспадарцы, даглядае агарод, шые. Больш за тое, яна піша карціны, найбольш пейзажы. У яе ёсць сябры, якія часам прадаюць работы. Такім чынам паяўляецца дадатковая капейка да пенсіі. Разам са сваім мужам Анатолем, інвалідам-калясачнікам, яны зрабілі цудоўны рамонт у кватэры ў чаканні сына. Але пасля нараджэння здаровага хлопчыка маці з малым больш за месяц не выпісвалі з бальніцы, пакуль вырашаўся іх лёс. Тым часам Ганна з дапамогай сяброў сумела прыцягнуць да сябе ўвагу СМІ. Пра яе стала вядома ў краіне. У Івацэвіцкай бальніцы мэтанакіраваную маці наведала тагачасны міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна. Міністр назвала сітуацыю нестандартнай і паабяцала дапамогу.

У бальнічнай палаце мы гутарылі з Ганнай, калі яшчэ ўсё вісела на валаску. 37-гадовая жанчына казала, што яе рашэнне стаць маці было свядомае і выпакутаванае. Сама яна вырасла ў дзіцячым доме, куды трапіла з прычыны свайго калецтва. І найбольшай марай усяго яе жыцця была звычайная сям'я, дзе ніхто нікому не здраджвае, ніхто нікога не пакідае ў бядзе. А нараджэнне здаровага дзіцяці бачылася ёй пасланнем нябёсаў за ўсе пакуты. Яна не магла аддаць сына, не магла змірыцца, нават калі шанцаў, здавалася, не засталося, і мясцовыя чыноўнікі сказалі рашучае «не». Але ж, як даўно сказана, хто стукае, таму і адчыняюць. Пасля візіту міністра пытанне стала вырашацца. Сям'і выдзелілі дзвюх нянек з тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія дапамагалі маці даглядаць малога да трох гадоў.

Цяпер Косціку хутка пяць, ён расце актыўны, рухомы, любіць ездзіць на самакаце, радуе бацькоў. А сацыяльны работнік прыходзіць у іх сям'ю тры разы на тыдзень. Аб гэтым расказала **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму Івацэвіцкага тэрытарыяльнага цэнтра Алена ЧАТЫРБОК.** Алена Мікалаеўна ведае Ганну даўно, з той пары, як сама Аня хадзіла ў дзённае аддзяленне. І не дзіва, што ўзрушаная маці пасля шчаслівага завяршэння гісторыі запрасіла Алену Мікалаеўну быць хроснай маці Косціка. А ганаровай хроснай свайго сына яна лічыць менавіта Мар'яну Шчоткіну, бо яе ўмяшальніцтва ўсё вырашыла. Дарэчы, Мар'яна Акіндзінаўна кожны год цікавіцца справамі гэтай не зусім звычайнай сям'і. Нездарма ж яна некалі паверыла ў сілу духу Ганны і сказала на ўсю краіну: «Трэба падтрымліваць жанчын, якія матываваныя на мацярынства». Тым самым зрабіла шчаслівай адну асобную сям'ю, якую маглі разбурыць.

## СВАЙГО АГАРОДУ РАБОТНІК

Прыведзеныя вышэй гісторыі — хутчэй выключэнне, чым правіла, бо там патрабавалася змаганне, рашучасць, ахвярнасць у рамках адной сям'і. А ў звычайным жыцці сям'я для любога служыць прычалам, хай сабе запасным, але надзейным аэрадромам, дзе можна сустрэць разуменне ў вачах, пачуць словы падтрымкі, перачакаць нейкія неспрыяльныя абставіны. Нядаўна давялося прачытаць кранальны сюжэт пра оперную спявачку Маргарыту Ляўчук, якая на перыяд пандэміі прыехала да бацькоў у вёску Страдзеч пад Брэстам. Маргарыта мае вядомасць у свеце опернага мастацтва, выступала на многіх оперных сцэнах свету. Пандэмія застала яе ў Італіі, спявачка вылецела на радзіму літаральна ледзь не апошнім самалётам. Але адбыўшы двухтыднёвы тэрмін самаізаляцыі ў мінскай кватэры адразу прыехала ў бацькоўскі дом. Тут з задавальненнем акунулася ў вясковыя агародна-гаспадарчыя клопаты. Ходзіць у госці да бабуль, прыбірае ў іх дамах, дапамагае па гаспадарцы. Стала здымаць забаўныя кліпы і дзяліцца здымкамі ў Інстаграме з калегамі-артыстамі, каб узняць ім настрой. Бо для актыўнага, творчага чалавека вымушаная самаізаляцыя пагражае абярнуцца дэпрэсіяй. А Рыце ў бацькоўскай сядзібе сумаваць не выпадае. Пра сябе яна сказала ў сецыве: «Першы работнік у агародзе».

Сёння многія сем'і аб'ядналіся вакол уласных агародаў і ў прамым, і ў пераносным сэнсе, бо знешнія стасункі рэзка скараціліся. І шчаслівы той, у каго гэты агарод моцны і надзейны. Цяпер усе адчулі, што сямейны капітал — не столькі той, які кладуць на рахунак пасля нараджэння трэцяга і наступных дзяцей, альбо які сама сям'я назапашвае на ўласным банкаўскім рахунку, а той, які гадамі выбудоўваецца з цаглінак адносін і не дае трэшчыну пры першым жа выпрабаванні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Сугучча

# АГУЛЬНАЯ ПАМЯЦЬ

## Трохтомнік твораў Васіля Быкава прэзентавалі ў Палтаве

**У 2019 годзе ва ўкраінскім выдавецтве «Знання» ў серыі «Галасы Еўропы» пабачылі свет тры тамы ваеннай прозы народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава: «Альпійская балада», «Мёртвым не баліць», «Знак бяды».**

Учора ў анлайн-рэжыме на кафедры журналістыкі Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя У. Г. Караленкі студэнцкі чытацкі клуб правёў прэзентацыю трохтомнага збору твораў класіка беларускай літаратуры. Вядоўца віртуальнай сустрэчы аматараў творчасці Васіля Быкава — дацэнт кафедры журналістыкі Глеб Кудрашоў.

— Ідэя не выпадковая, — падзяліўся сваімі развагамі ў пярэдадзень прэзентацыі Глеб Кудрашоў. — Украінскі чытач добра ведае быкаўскую прозу ў перакладах Галіны Вігурскай. А вось у трохтомнік увайшла яшчэ і перакладчыцкая праца Таццяны Кабржыцкай, якая жыве і працуе ў Беларусі, шмат робіць дзеля прадстаўлення беларускай літаратуры ва Украіне і ўкраінскай у Беларусі. Дарэчы, Вігурская пераклала ў свой час на ўкраінскую мову і «Віленскіх камунараў» Максіма Гарэцкага, і «Трывожнае шчасце» Івана Шамякіна, і творы Івана Мележа, Янкі Брыля, Янкі Маўра... Мяркую, што наша анлайн-прэзентацыя — добрая нагода пагаварыць увогуле пра беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі, нагадаць студэнцкай моладзі пра багацце беларускага мастацкага слова.

Глеб Кудрашоў — добра вядомы ў Беларусі і Украіне даследчык беларуска-ўкраінскіх літаратурных, гуманітарных сувязяў. Некаторы час назад была выдадзена яго кніга пра адрасы мемарыялізацыі памяці Тараса Шаўчэнкі ў Беларусі. Зараз у Мінску рыхтуецца выданне гэтай кнігі ў перакладзе на беларускую мову.

# Новая беларуская кніга — у Сербіі

## У Бялградзе падрыхтавана да друку новая беларуская кніга — «Залаты птах»

**Укладальнікам зборніка беларускіх народных казак выступіў прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук Іван Аляксеевіч Чарота. Пераклала творы беларускага фальклору на сербскую мову Даяна Лазаравіч.**

Сёння, калі свет з-за пандэміі каранавіруса стрымлівае свае актыўнасці ў сувязях, стасунках надзвычай выразна, факт выдання перакладной кнігі значыць вельмі шмат. Не абрываецца тым самым гуманітарная повязь Беларусі і Сербіі, а наадварот — усталёўваецца трывалы мост дружбы і супрацоўніцтва.

Мяркуецца, што пасля выдання кніга беларускіх народных казак патрапіць у школьныя бібліятэкі Сербіі.

Трэба нагадаць, што «Залаты птах» — прадаўжэнне выдання той беларускай бібліятэкі на сербскай мове, над чым рупіцца перакладчыца Даяна Лазаравіч. Апошнія гады прынеслі сербскаму чытачу сустрэчы з кнігамі беларускіх паэтаў і празаікаў Максіма Багдановіча, Сяргея Панізніка, Алеся Бадака, Святланы Быкавай, Марыі Кобец, Віктара Кажуры і іншых аўтараў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Дата

## За міласэрнасць і ўзорны прафесіяналізм

### Шэсць медсясцёр у Беларусі маюць навышэйшую ўзнагароду

**Медаля імя Флорэнс Найцінгейл — найвышэйшай узнагароды для медыцынскіх сясцёр у свеце — удастоены шэсць медсясцёр за мужнасць і самаадданасць у гады Вялікай Айчыннай вайны. І столькі ж — у мірны час, у тым ліку пяцёра — медыцынскія сёстры міласэрнасці Чырвонага Крыжа, за служэнне адзінокім пажылым і цяжкахворым людзям. Пра гэта расказала генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО.**

Учора, 12 мая, ва ўсім свеце адзначаўся Міжнародны дзень медыцынскай сястры, прафесійнае свята ў гонар Флорэнс Найцінгейл — заснавальніцы сястрынскай справы. Прычым сёлета споўнілася 200 гадоў з дня яе нараджэння.

Паслядоўнікі Флорэнс Найцінгейл у Беларусі, супрацоўнікі медыка-сацыяльнай службы Чырвонага Крыжа «Дапамога» штодзень прыходзяць да тых, каму неабходна падтрымка. У межах гэтай праграмы працуюць 147 медыцынскіх сясцёр міласэрнасці і 18 малодшых сясцёр міласэрнасці, якія дапамагаюць 1,5 тысячы чалавек па ўсёй краіне. Падапечныя службы — адзінокія і адзінока пражываючыя пажылыя людзі, інваліды, хворыя з цяжкімі хранічнымі захворваннямі і псіхічнымі расстройствамі, тыя, хто жыве з ВІЧ/СНІД.

Унікальнасць медыка-сацыяльнай службы Чырвонага Крыжа — у аказанні комплекснай медыцынскай і сацыяльнай дапамогі дома. Гэта і назіранне за станам здароўя, медыцынскія працэдуры, індывідуальны догляд, псіхасацыяльная падтрымка і дапамога ў гаспадарча-бытавых справах, а таксама навучанне блізкіх асновам догляду, сама- і ўзаемадапамогі. Эфектыўнасць усіх гэтых відаў дапамогі немагчымая без ведаў і навыкаў. Медыцынскія сёстры міласэрнасці — спецыялісты з медыцынскай адукацыяй, больш за 70 % з іх маюць кваліфікацыйную катэгорыю.

— Нагрузка ў нас — каласальная. Прычым я маю на ўвазе не сумкі, якія даводзіцца насіць з магазіна, і не гатаванне, з якім просяць дапамагчы мае падапечныя, а псіхалагічны момант. Кожны чалавек са сваім характарам, і задача медыцынскай сястры — знайсці да яго ключык, — расказвае **Таццяна СІРОШ, галоўная медыцынская сястра Дарожнай арганізацыі Беларускай чыгункі Беларускага Чырвонага Крыжа.** — Вось і атрымліваецца, што падчас кантактавання мы становімся сябрамі, жывём радасцямі-клопатамі адзін аднаго, і калі ў маіх бабуль-дзядуль штосьці баліць, то баліць і ў мяне. А калі хтосьці з іх памірае — гэта трагедыя, доўга хаджу сама не свая.

Найвышэйшая ўзнагарода медсясцёр, медаль Флорэнс Найцінгейл, заснавана ў 1912 годзе Міжнароднай лігай Чырвонага Крыжа. Яна прысуджаецца кожныя два гады за выключную прыхільнасць справе міласэрнасці, гуманнасць і ўзорную прафесійную дзейнасць.

Скажыце, доктар...

# ШТО ПАДКАЗВАЕ ЦЕЛА?

## ЯКІЯ ХВАРОБЫ МОЖА ВЫКЛІКАЦЬ НАШ ПСІХАЛАГІЧНЫ СТАН, І ЯК ІХ РАСПАЗНАЦЬ

**Наш арганізм — гэта адзіная структура. І прычыны цялесных недамаганняў вельмі часта тлумачацца нашым псіхалагічным станам. Просты прыклад саматычнага расстройства — зваліцца ад банальнай прастуды ў той час, калі мы стаміліся ці нас чакаюць складаныя і непрыемныя справы. Так на падсвядомым узроўні мы атрымліваем тое, чаго не хапае. Таму важна шукаць і ліквідаваць прычыну хваробы, а не толькі яе прыкметы. Як наша псіхіка правакуе сабатаж і пра што нам можа «крычаць» наша цела, расказала ўрач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Мінска Наталля СЯДАЧ.**

З пункту погляду псіхасаматыкі за нашымі хваробамі стаяць схаваныя жаданні, страхі, канфлікты, падаўленыя крыўды, псіхічныя траўмы. Чалавек праз цела можа «прад'яўляць» боль, калі яго псіхалагічныя траўмы не знаходзяць іншага выхаду. У выніку праз нейкі час наша цела пачынае адлюстроўваць тое, што адбываецца ў нашай душы.

— Яшчэ ў 30-я гады мінулага стагоддзя адзін з заснавальнікаў псіхасаматыкі Франц Александэр вылучыў групу з сямі класічных псіхасаматычных захворванняў, так званую «святую сямёрку». У яе ўваходзілі эсэнцыяльная (пярвічная) гіпертанія, язвавая хвароба страўніка, рэўматоідны артрыт, гіпертырэёз, бранхіяльная астма, каліт і нейрадэрміт. Цяпер спіс псіхасаматычных расстройстваў значна пашырыўся, — расказвае Наталля Сядач.

Асноўныя прычыны той жа бранхіяльнай астмы цалкам не высветлены. Самымі значнымі фактарамі, якія правакуюць яе развіццё, лічацца генетычная схільнасць у спалучэнні з трапляннем у дыхальныя шляхі тых ці іншых алергенаў, інфекцыя, эмацыянальныя фактары. Таксама спрыяць развіццю захворвання могуць халоднае паветра, крайняе эмацыянальнае ўзбуджэнне (такое, як гнеў ці страх), фізічныя нагрузкі. Астму могуць справакаваць і некаторыя лекавыя прэпараты, такія як аспірын і іншыя нестэроідныя супрацьзапаленчыя лекі, а таксама бэта-блакатары (выкарыстоўваюцца для лячэння гіпертаніі, хвароб сэрца і мігрэні).



— Калі казаць пра псіхалагічныя прычыны ўзнікнення гэтай хваробы, то імі прынята лічыць немагчымасць чалавека «дыхаць на поўныя грудзі». Часта астма прыходзіць тады, калі наша жыццёвая сітуацыя складваецца такім чынам, што мы шукаем і не знаходзім «аддушыны», жывём у «цяжкай прыгнятальнай атмасферы», не атрымліваючы «глытка свежага паветра», — тлумачыць урач.

Спускавым механізмам развіцця гэтага захворвання можа паслужыць і неспрыяльная абстаноўка на рабоце, дзе, як нам здаецца, нам «перакрываюць кісларод». Ці, напрыклад, сітуацыя, калі дакучлівыя дальнія сваякі, якія пераехалі быццам бы на кароткі час, трывала асталёўваюцца ў нашай кватэры — так, што «не прадыхнуць». Праблемы з дыханнем узнікаюць і ў людзей, блізкія якіх літаральна «душаць» іх сваім клопатам, асабліва ў дзяцей, чые бацькі занадта моцна «сціскаюць іх у сваіх абдымках». Псіхааналітыкі лічаць, што ў такіх людзей ёсць праблема з адстойваннем сваіх меж і забаронай на выражэнне злосці і агрэсіі.

Наталля Сядач удакладняе, што, паводле даных назіранняў за пацыентамі, псіхатэрапеўты прыйшлі да высновы: большасці астматыкаў складана плакаць. Як правіла, у жыцці яны зусім не плачуць. Як казаў вядомы псіхатэрапеўт Валерый Сінельнікаў, астма — гэта падаўлены ўсхліп, спроба выразіць тое, што іншым шляхам паказаць немагчыма.

— Лічыцца, што многія хворыя на астму выраслі ў сем'ях, дзе высока цаніліся дасягненні, прад'яўляліся занадта высокія патрабаванні. «Збярыся!», «Пастарайся!», «Вазьмі сябе ў рукі!», «Глядзі, не падвядзі!» — гэтыя і падобныя заклікі часта чулі такія дзеці. Разам з тым праявы незадаволенасці, агрэсіі і іншых негатыўных эмоцый малымі падаўляліся. Ім немагчыма было ўступіць у адкрыты канфлікт з бацькамі, іх пачуцці заглушаліся. І такі чалавек маўчыць, нават калі вырастае, а яго цела размаўляе на мове сімптомаў бранхіяльнай астмы, так яно просіць аб дапамозе, — расказвае суразмоўніца.

**«Лічыцца, што многія хворыя на астму выраслі ў сем'ях, дзе высока цаніліся дасягненні, прад'яўляліся занадта высокія патрабаванні. «Збярыся!», «Пастарайся!», «Вазьмі сябе ў рукі!», «Глядзі, не падвядзі!»**

Гэтак жа большасць навукоўцаў сыходзіцца ў думках, што, акрамя медыцынскіх прычын, у развіцці язвы страўніка адыгрывае ролю доўгі стрэс і асаблівасці характару, якія характэрныя для многіх язвавых пацыентаў.

Псіхолагі схільныя думаць, што часта язва страўніка ўзнікае ў людзей трывожных, ранімых, няўпэўненых у сабе, якія ў той жа час прад'яўляюць да сябе непамерна высокія патрабаванні і вылучаюцца гіперадказнасцю. Яны заўсёды незадаволеныя сабой, схільныя да самабічавання і «самаедства». Гэта ім прысвечаны афарызм: «Прычына язвы не ў тым, што вы ясцё, а ў тым, што мучае вас». Нярэдка на язвавую хваробу пакутуюць тыя, хто «ўвязнуў» у той ці іншай сітуацыі, няздольны прыняць новыя абставіны свайго жыцця. «Мне патрэбны час, каб гэта перапварыць», — тлумачыць такі чалавек, а яго страўнік тым часам пераварвае сам сябе.

— Канешне ж, пры любым захворванні найперш варта звярнуцца да ўрача адпаведнага профілю і старанна абследавацца. Але калі хвароба дрэнна паддаецца лячэнню, самаадчуванне пагаршаецца на фоне канфлікту ці стрэсу, то варта задумацца, ці не з'яўляюцца вашы праблемы са здароўем следствам нявыражаных эмоцый, падаўленых крыўдаў, перажыванняў і страхаў. Ці не прымушаюць нашы нявыплаканыя слёзы плакаць наша цела? Разабрацца ў гэтым дапаможа псіхатэрапеўт.

## Бессімптомна і ў лёгкай форме

### Большасць беларусаў перахварэюць на COVID-19

**Каля 80 % беларусаў перанясуць каранавірусную інфекцыю або бессімптомна, або ў лёгкай форме ў выглядзе вострага рэспіраторнага захворвання. Пра гэта расказаў падчас анлайн-стрыму галоўны пазаштатны інфекцыяніст камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Мікіта САЛАВЕЙ.**

Ён расказаў, што большасць людзей у свеце перахварэе на COVID-19. І насельніцтва Беларусі таксама. Пры гэтым пацыенты, якія хварэюць лёгка ці бессімптомна, не трапляюць у поле зроку медыкаў: яны не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу і не абследуюцца лабараторна. Таму колькі беларусаў рэальна перахварэе на гэту інфекцыю, будзе ўдакладнена, калі пройдзе эпідэмія і пратэсціруюць вялікую колькасць людзей.

Як адзначыў спецыяліст, нельга сказаць, што цяпер у папуляцыі цыркулюе нейкі моцна зменены штам COVID-19.

— Цыркулюе адзін і той жа вірус — ён крыху змяняецца, і гэта характэрна для любых рэспіраторных вірусаў, уключаючы грып. Як паказвае вопыт папярэдніх успышак рэспіраторных інфекцый, другая і трэцяя хвалі захворвання заўсёды працякалі лягчэй, чым першая. Тое самае мы бачылі ў 2010 і 2011 гадах у сітуацыі з пандэмічным грыпам. Спачатку гэты вірус выклікаў пандэмію, а пасля стаў звычайным сезонным грыпам і працягвае цыркуляваць цяпер, перыядычна выклікаючы павышэнне захваральнасці без цяжкіх формаў. Спадзяёмся, што тая ж сітуацыя будзе і з COVID-19, — адзначыў Мікіта Салавей.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Каб помнілі

## ЯНЫ ТАКСАМА КАВАЛІ ПЕРАМОГУ

**...Гляджу на здымак мамы, зроблены 9 мая 1945-га, і думаю, што калі б не Перамога (і сапраўды вялікая!), то не было б на свеце ні мяне, ні малодшага брата, ні мільёнаў пасляваенных дзяцей.**

Калі пачалася вайна, маёй маме Таццяне Архіпаўне Пятровай *(на здымку яна другая справа)* было толькі 13. Сям'я (бабуля і пяцёра дзяцей) жыла ў вёсцы Вілейка нашага Чавускага раёна ў зямлянцы, якую выкапала на сваім жа агародзе, бо з хаты выгналі акупанты.



Яны ж у 1943-м разам з іншымі такімі падлеткамі вывезлі маму ў Віцебскую вобласць капаць акопы.

Ад гэтай цяжкай прымусовай работы моладзь вызвалілі байцы Чырвонай Арміі, якая наступала. Хворых і слабейшых дзяўчат тады адправілі дамоў, а мацнейшых пакінулі — некага пры медсанбатах і шпіталях, некага, як маю матулю, — пры гаспадарчых падраздзяленнях вайсковай часці. А ўжо там даводзілася рабіць многае: мыць адзенне, працаваць на кухні, пасвіць коней... Зрэшты, мама не любіла гаварыць пра вайну, лічыла, што зусім няшмат зрабіла для Перамогі.

А сустрэла яна яе ў горадзе Штэцін. Тады ж атрымала сваю адзіную ўзнагароду — медаль «За перамогу над Германіяй...»

Ветэранаў, якія кавалі яе, застаецца, на жаль, усё менш і менш. Тым большая, на мой погляд, адказнасць на нас, іх нашчадках. Я, напрыклад, размножыў гэтае фота і падарыў сваім унукам, каб памяталі і ганарыліся, каб захоўвалі памяць.

**Валерый ГАЎРЫШ,**
*г. Чавусы.*

Весткі з месцаў

## Задача — дапамагчы...

**Моладзь гэтага, можа, і не заўважае, а вось людзі старэйшыя са мной пагодзяцца: вельмі хутка пралятае жыццё. Толькі ўчора, здаецца, я была студэнткай і маладой настаўніцай, а між тым за плячыма ўжо 42 гады працы, урачыстыя провады на заслужаны адпачынак. А вось што далей?**

Спачатку — помню — настрой у мяне быў добры: не трэба спяшацца на работу, можна адпачываць, але ж гэта нейкі тыдзень-другі...

З Алай Рыгораўнай Бакуновіч я сустрэлася выпадкова і прыняла яе запрашэнне зайсці ў наш Ленінскі раённы камітэт прафсаюза работнікаў адукацыі, які яна ўзначальвае, у савет ветэранаў. Там мне даручылі свайго роду шэфства над снайперам-зенітчыцай Таццянай Антонаўнай Кузняцовай. Каля 10 гадоў мы сустракаліся з гэтай цудоўнай жанчынай... А паралельна я з цікавасцю збірала звесткі для альбома пра заслужаных настаўнікаў нашага раёна.

Асноўная задача савета ветэранаў — валанцёрскі рух, дапамога людзям у складаных жыццёвых сітуацыях, правядзенне святочных мерапрыемстваў, ушанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Успамінаюцца таксама цікавыя экскурсіі ў Віцебск, Полацк, Нясвіж...

У поспехах работы арганізацыі вялікая заслуга Алы Рыгораўны Бакуновіч, начальніка ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна Наталлі Генадзеўны Кучынскай, многіх актывістаў.

Дзякуючы агульным намаганням, мы можам смела сказаць, што «ніхто ў нас не забыты».

**Э. І. ВАСІЛЕВІЧ,**
*г. Мінск.*

Была вайна

## Першая цацка

**У маім пакоі на канапе сядзіць чорны кот — з пазалочаным хвастом і вушкамі, з зялёнымі вочкамі... Як напамінак пра маё «шчаслівае» маленства.**

Цацка ў ім была адна — жоўты бліскучы ваўчок — галоўка ад нейкага снарада. Мы з сяброўкай, прытрымліваючы цвіком, накручвалі на яго шнурок і рэзка адпускалі — ваўчок круціўся на падлозе...

І лялька ў мяне была адна, нават не цэлая: толькі галоўка з фарфору, а тулава, рукі і ногі трэба было пашыць самім. Мы справіліся: нешта згарусцілі, абкруцілі латкамі, што заставаліся ад мамінага шыцця, але гуляць з гэтай лялькай я саромелася. Ды і мама да таго неяк не заахвочвала, бо сама вырасла ў шматдзетнай сям'і, змалку працавала і нас да таго ж прывучала. Мы скублі пер'е, сукалі цэўкі да кроснаў, палолі грады, пасвілі гусей...

Дык вось гэты чорны кот, што цяпер сядзіць на канапе, — мая першая сапраўдная цацка. І дарагая-дарагая, бо яе мне падарыла сястра Вера — на мой юбілей, на 80-годдзе.

**Леанарда АЛЯШЭВІЧ,**
*г. Смаргонь.*

Даты

## Напісанае і сапраўды застанецца

**Для пачатку і для знаёмства — некалькі лічбаў. Мне — 78, маім дзецям (а іх у мяне пяцёра) — за 50, унукам — каля 30. Усе, як бачыце, людзі дарослыя. І ўсе ў дзяцінстве з цікавасцю чыталі часопіс «Вясёлка».**



Я ведала, што рэдагуе яго (а цяпер яшчэ «Бусю» для маёй праўнучкі Сонечкі) пісьменнік Уладзімір Ліпскі. Аднак уявіць, што нашы жыццёвыя сцежкі могуць недзе сысціся ці хоць бы перасекчыся, — дык нават у думках не было.

Сама я змалку любіла чытаць, любіла вышываць... Як сябру Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, мне пашчасціла паездзіць з маімі работамі па Беларусі, пабываць у Маскве, у Літве.

А неяк мяне запрасілі ў Слонім на рэспубліканскі фестываль «Жывіце ў радасці». Паколькі ён быў прысвечаны менавіта сямейнай творчасці, разам са мной паехалі тры дачушкі і дзве ўнучкі. Там працавала мая, на жаль, яшчэ невялікая выстаўка, было шмат народу, які прыходзіў на ўсё паглядзець.

Завітаў тады і пісьменнік Уладзімір Ліпскі (ён быў у складзе журы). Сказаў, што вельмі шмат чуў пра мяне, чытаў у газетах, захапляўся маім талентам і працаздольнасцю (а я, між іншым, яго...). Мы трошкі паразмаўлялі пра жыццё, пра сям'ю, пра творчасць. Усіх тады вельмі ўразілі мае вышываныя «палотны» — дываны. Мы з журы нават сфатаграфаваліся на іх фоне.

Гэтага аднаго ўжо было б дастаткова, каб помніць і сустрэчу, і фестываль, але ж потым, на яго завяршэнні, пачалося ўзнагароджанне, і Уладзімір Сцяпанавіч, уручаючы мне дыплом лаўрэата і каштоўны падарунак, перад усёй паўнюткай залай расказаў пра тое, як я з пяццю дзеткамі (малодшая ў школу не хадзіла) у 39 гадоў засталася ўдавой, як у 5 гадзін раніцы бегла на ферму, як працавала там без выхадных, без дэкрэтных і проста адпачынкаў, як у мяне адной, без мужа, цягам 14 гадоў былі студэнты (часам нават па трое), і як кожнаму я хацела дапамагчы...

Тады ж Уладзімір Сцяпанавіч уручыў мне аўдыякасету сваёй кнігі «Мама. Малітва сына».

Дзячыць за ўсё гэта мне давялося са слязамі на вачах.

...Другі раз мы сустрэліся з Уладзімірам Ліпскім на святе пісьменства ў Барысаве. Я з радасцю падарыла яму сваю вышыванку, а ён мне — кнігу «Аўцюкоўскія шуры-муры». Потым была яшчэ адна сустрэча — ужо ў Глыбокім...

А паміж імі — цэлых 13 гадоў знаёмства, калі мы, хай не так часта, але ж абменьваліся тэлефоннымі размовамі, падарункамі, лістамі, віншаваннямі.

Я радуюся, калі ў пісьменніка выходзіць чарговая кніга, і прашу Бога, каб усё, напісанае ім, людзі чыталі, каб набіраліся розуму і дабрыні, бо як для мяне, дык кожны твор Ліпскага — сапраўдны падарунак. Нельга без хвалявання, без слёз чытаць яго «Уліпкі», дзе кожны дзянёк 2015-га асветлены падзеямі і разважаннямі, яго лісты да бацькоў...

Днямі Уладзімір Сцяпанавіч адзначыў сваё 80-годдзе. Пра яго з гэтай нагоды гаварылі па радыё і тэлебачанні, пісалі ў газетах. Расказвалі, колькі напісана кніг, колькі нумароў яго «Вясёлак» і «Бусь» прыйшло да дзяцей, як шмат у гэтага пісьменніка ўзнагарод і званняў, як даўно ён узначальвае праўленне Беларускага дзіцячага фонду...

Усё гэта я паўтараць не буду. Проста хачу паспадзявацца, што Бог (яшчэ і маімі малітвамі!) на многія-многія гады пашле гэтаму руплівцу-працаголіку здароўя і натхнення на новыя творы.

**Л. Р. ЗАРЭЦКАЯ,**
*аг. Навасёлкі, Пастаўскі раён.*

Ёсць прапанова!

## ВЯРНУЦЬ БЫ СЕРЫЮ!..

**У свой час рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і мастацтва» выдавала кніжную серыю мастацкіх твораў пра жыццё і творчасць вядомых беларускіх пісьменнікаў. У ёй, гэтай серыі, выйшлі кнігі «Максім Багдановіч: вядомы і невядомы»; «Сяргей Грахоўскі: вядомы і невядомы», «Іван Шамякін: вядомы і невядомы», «Васіль Быкаў: вядомы і невядомы»...**

Упрыгожаннем серыі стала кніга пра вядомага і невядомага Уладзіміра Караткевіча (укладальнікі — Анатоль Верабей, Мікола Мінзер і Сяргей Панізнік). У першую частку яе ўвайшло эсэ Алега Лойкі «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі». У другую — «Белая песня ў лугах залацістых...» — паэтычныя творы У. Караткевіча, якія былі напісаны ў перыяд яго натхнення маскоўскай музай Нінай Молевай, альбо творы, па часе і характары блізкія да гэтага перыяду; лісты, дарчыя надпісы, успаміны самой Ніны Молевай.

Трэцяя частка — творы, прысвечаныя У. Караткевічу, дзе сярод аўтараў, акрамя беларускіх пісьменнікаў, латыш Андрыс Веянс, украінец Раман Лубкіўскі, армянін Арташэс Пагасян, рускі паэт і перакладчык Якаў Хелемскі, в'етнамскі літаратар Ле Чонг Шам. Кніга, выдадзеная немалым па сённяшнім часе накладам — 1500 экзэмпляраў, разышлася даволі хутка. Цяпер яе не знайсці ні ў кнігарнях, ні ў самім выдавецтве (правапераемнікам РВУ «Літаратура і мастацтва» стаў Выдавецкі дом «Звязда»).

З кнігі «Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы» класік беларускай літаратуры прадстаў досыць рэльефна і найперш — дзякуючы эсэ Алега Лойкі «Уладзімір Караткевіч, або Паэма Гарсія Лойкі» (не блытайце «Гарсія Лойку» з іспанскім паэтам, драматургам, мастаком Гарсія Лоркам!). Ва ўступным слове «Подзвіг творцы» адзін з укладальнікаў — Анатоль Верабей — заўважыў: «Алег Лойка па-свойму глянуў на постаць Уладзіміра Караткевіча, паказаў яго як рэальнага, зямнога чалавека і як генія. Уласныя згадкі і развагі пра творчую спадчыну Уладзіміра Караткевіча ўдала падмацаваў вытрымкамі з яго лістоў да Якуба Коласа, Максіма Танка, Янкі Брыля, яго дзённікавымі запісамі, успамінамі пра яго Уладзіміра Калесніка, Фларыяна Няўважнага і іншых асоб. Плённа выкарыстаў і набыткі караткевічазнаўства, напрыклад, кнігі Адама Мальдзіса «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека» (1990).

Апраўдана і тое, што Алег Лойка падаў у творы свае рэцэнзіі на першыя паэтычныя зборнікі Караткевіча «Матчына душа» і «Вячэрнія ветразі». Ён слушна сказаў пра своеасаблівае спалучэнне ў яго паэзіі лірычных і эпічных элементаў. Падкрэсліў, што «адметнай і вельмі прыемнай адзнакай творчай індывідуальнасці Караткевіча з'яўляецца яго шырокая эрудыцыя». І сёння заслугоўвае ўхвалы тое, што Алег Лойка зычліва і эмацыянальна, улічваючы спецыфіку рамантычнага таленту паэта і яго светаўспрыманне, на высокім прафесійным узроўні ахарактарызаваў яго першыя паэтычныя зборнікі. Выключную каштоўнасць маюць і асабістыя згадкі Алега Лойкі пра тагачасны літаратурны працэс, пра адносіны паміж сабой літаратараў, пра перыпетыі шляху Караткевіча ў літаратуру.

Алег Лойка напісаў не хроніку жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча, а стварыў свой, шматгранны і непаўторны яго вобраз як чалавека і творцы...»

Дзевяностагадовы юбілей Уладзіміра Караткевіча (1930—1984), які ў Беларусі, ды і за яе межамі будзе адзначацца ў лістападзе 2020 года, — ці не самая добрая нагода: па-першае, перавыдаць зборнік «Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы», а па-другое, увогуле вярнуць да жыцця кніжную серыю, якая магла б заняць пэўную вартасную нішу ў беларускім кнігавыданні.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ,**
*г. Мінск.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# Извещение (информация) о проведении 23 июня 2020 года аукционных торгов по продаже изолированного торгового помещения

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)** | **Изолированное торговое помещение по адресу: г. Минск, ул. Московская, д. 7, пом. 2Н, общая площадь – 82,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-707945926 (подвальный этаж, назначение – торговое помещение)** |
| **Начальная цена без учета НДС, бел. руб.** | 16 900,00 |
| **Размер задатка, бел. руб.** | 3 000,00 |
| **Реквизиты для перечисления задатка и сроки его внесения** | Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, получатель – государственное предприятие «МГЦН», назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 23.06.2020 в срок, установленный для приема документов |
| **Продавец имущества** | УП «БЕЛТРАНСАВТОМАТИКА», 220007, г. Минск, ул. Московская, 7, тел. (017) 225-26-71 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 327-48-36 |
| **Форма проведения торгов** | Открытый аукцион на повышение начальной цены |
| **Порядок, в соответствии с которым проводятся торги** | Положение о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 |

Аукционные торги проводятся **23 июня 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **по 18.06.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до даты проведения аукциона.

**Порядок оформления участия в торгах**

К участию в торгах допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные юридические лица, граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, лица без гражданства, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в торгах, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка по соответствующему предмету торгов, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников торгов с указанием даты регистрации заявления.

К заявлению прилагаются:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, **с отметкой банка**;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Порядок проведения торгов**

Перед началом торгов их участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и обменять билеты участников торгов на аукционные номера, которые возвращаются организатору торгов после их окончания.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором торгов. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене продажи предмета аукциона аукционный номер не поднимет только один его участник. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона **и не включает НДС**. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Обязанности победителя торгов (единственного участника торгов):**

подписать протокол о результатах торгов в день проведения аукциона;

возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов (информация о затратах доводится до сведения участников перед началом торгов);

подписать с продавцом имущества договор купли-продажи предмета торгов в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона;

оплатить стоимость приобретенного имущества **с учетом НДС** в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи (рассрочка оплаты предоставляется в порядке, установленном законодательством).

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 327-48-36, продавец имущества (по вопросам осмотра предмета торгов) – (017) 225-26-71, (044) 557-51-35.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

**Государственное предприятие «МГЦН» сообщает о внесении следующих изменений в извещение о проведении 27 мая 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5» (опубликовано в газете «Звязда» 11.05.2020):**

- в таблице слова «Начальная цена предмета торгов с учетом НДС» **следует читать** «Начальная цена предмета торгов без учета НДС»;
- в тексте извещения слова «наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС» **следует читать** «наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС».

**Телефон для справок +375 (17) 327 48 36.**

УНП 190398583

# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Лужки, ул. Подгорная, д. Грудок, д. Дуброва, ул. Магистральная, д. Прилепская Усяжка, д. Прилепы Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **18 июня 2020 года в 15.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний** |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,0827 га, № 624883005601000187, д. Лужки, ул. Подгорная<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624883002601000051, д. Грудок<br>Лот № 3 – площадь 0,0908 га, № 624883003801000327, д. Дуброва, ул. Магистральная<br>Лот № 4 – площадь 0,1115 га, № 624883008201000126, д. Прилепская Усяжка<br>Лот № 5 – площадь 0,1500 га, № 624883008301000543, д. Прилепы |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 20000 рублей; Лот № 4 – 12000 рублей;<br>Лот № 2 – 15000 рублей; Лот № 5 – 30000 рублей;<br>Лот № 3 – 15000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики;<br>в) без права предоставления рассрочки;<br>г) возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку,<br>в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72<br>«О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» в размерах определенных решением Смолевичского райисполкома,<br>д) при подаче заявления на определенный лот только одним участником земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>е) наличие не менее двух участников |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Лужки, ул. Подгорная – электроснабжение, водоснабжение;<br>д. Грудок – нет;<br>д. Дуброва, ул. Магистральная – подъездные пути, электроснабжение;<br>д. Прилепская Усяжка – подъездные пути, электроснабжение, газоснабжение;<br>д. Прилепы – подъездные пути |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот № 1 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,0827 га);<br>Лот № 3 – водоохранная зона Дубровского водохранилища (площадь 0,0908 га) |
| 11 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка<br>р/с BY50AKBB36410000006146200000<br>БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк»,<br>ЦБУ 621 г. Смолевичи, УНП 600046563<br>(с пометкой «Задаток за земельный участок») |
| 13 | **Порядок предварит. ознак. в натуре с земельным уч.** | Среда в 10.00 |
| 14 | **Начало приема документов** | с 18 мая 2020 г.<br>в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | **Окончательный срок приема документов** | 12 июня 2020 года в 17.00 |
| 16 | **Контактный телефон** | 8-01776-29-395, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 2001,83 руб., лот 2 – 1763,91 руб., лот 3 – 1990,05 руб., лот 4 – 1826,58 руб., лот 5 – 1631,96 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет продавца.

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

Утерянный представительством Белгосстраха по Узденскому району страховой полис по добровольному страхованию имущества граждан формы 2РН, серия ИГ № 8047913 в количестве 1 шт. **считать недействительным.**

УНП 100122726

БТА БАНК

# Закрытое акционерное общество «БТА Банк»

Финансовая отчетность и аудиторское заключение независимых аудиторов за год, закончившийся 31 декабря 2019 года

## ЗАО «БТА БАНК»

### ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2019 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | 31 декабря 2019 года | 31 декабря 2018 года |
|---|---|---|---|
| **АКТИВЫ** | | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 5 | 87 227 | 21 967 |
| Обязательные резервы | 6 | 2 602 | 1 212 |
| Средства в банках и иных финансовых учреждениях | 7 | 1 193 | 2038 |
| Активы по производным финансовым инструментам | | 17 | - |
| Ценные бумаги, оцениваемые по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | 8 | 44 650 | 32 910 |
| Кредиты клиентам | 9 | 203 927 | 133 755 |
| Основные средства и нематериальные активы | 10 | 10 049 | 10 339 |
| Инвестиционная недвижимость | 11 | 793 | - |
| Актив по текущему налогу на прибыль | 12 | 134 | 689 |
| Актив по отложенному налогу на прибыль | 12 | 297 | - |
| Прочие активы | 13 | 277 | 661 |
| **Итого активы** | | **351 166** | **203 571** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬТВА И КАПИТАЛ** | | | |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | 14 | 15 618 | 19 964 |
| Средства клиентов | 15 | 233 843 | 104 423 |
| Долговые ценные бумаги, выпущенные банком | 16 | 38 731 | 20 820 |
| Текущее обязательство по текущему налогу на прибыль | | - | 62 |
| Прочие обязательства | 17 | 1 080 | 674 |
| Субординированные кредиты (займы) | 18 | 14 184 | 12 959 |
| **Итого обязательства** | | **303 456** | **158 902** |
| **КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 19 | 45 318 | 45 318 |
| Накопленный убыток | | (2 909) | (5 676) |
| Фонд переоценки ценных бумаг | | 36 | 6 |
| Фонд переоценки основных средств | | 5 265 | 5 021 |
| **Итого капитал** | | **47 710** | **44 669** |
| **Итого капитал и обязательства** | | **351 166** | **203 571** |

## ЗАО «БТА БАНК»

### ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2019 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы | | 18 562 | 10 559 |
| Процентные расходы | | (10 725) | (6 041) |
| **Чистый процентный доход** | **21** | **7 837** | **4 518** |
| Резерв под обесценение финансовых активов | 7,8 | (1 687) | 785 |
| **Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов** | | **6 150** | **5 303** |
| **Чистые комиссионные доходы** | **22** | **7 065** | **4 845** |
| Чистая прибыль по операциям в иностранной валюте: | | | |
| торговые операции | | 1 845 | 1 175 |
| переоценка валютных статей | | 653 | 572 |
| Финансовый результат по ценным бумагам, оцениваемым по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | | (6) | (31) |
| Прочие доходы | 23 | 378 | 441 |
| **Непроцентные доходы** | | **9 935** | **7 002** |
| Расходы на персонал | 24 | (6 982) | (6 690) |
| Амортизация | 10 | (936) | (529) |
| Прочие операционные расходы | 24 | (4 781) | (4 110) |
| **Непроцентные расходы** | | **(12 699)** | **(11 329)** |
| **Прибыль до налогов** | | **3 386** | **976** |
| Расходы по налогу на прибыль | 12 | (619) | 299 |
| **Чистая прибыль** | | **2 767** | **1 275** |
| **Прочий совокупный доход** | | | |
| *Прочий совокупный доход, не подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах* | | | |
| Результат от изменения стоимости зданий | 10 | 325 | 1 022 |
| Расход по отложенному налогу на прибыль от изменения стоимости зданий | 12 | (81) | (255) |
| *Прочий совокупный доход, подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах* | | | |
| Переоценка справедливой стоимости ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | | - | 22 |
| За вычетом финансового результата по ценным бумагам, оцениваемым по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода, перенесенного в отчет о прибыли и убытках | | 6 | 31 |
| Резерв под обесценение ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | | 24 | (157) |
| **Прочий совокупный доход** | | **274** | **663** |
| **Итого совокупный доход** | | **3 041** | **1 938** |

## ЗАО «БТА БАНК»

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2019 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

| | Примечания | Уставный капитал | Фонд переоценки основных средств | Фонд переоценки инвестиционных ценных бумаг | Накопленный убыток | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **31 декабря 2017 года** | | **45 318** | **4 254** | **(64)** | **(5 742)** | **43 766** |
| Влияние перехода на МСФО 9 по состоянию на 1 января 2018 года | 3 | - | - | 174 | (1 209) | **(1 035)** |
| Совокупный доход за период | | - | 767 | (104) | 1 275 | **1 938** |
| **31 декабря 2018 года** | | **45 318** | **5 021** | **6** | **(5 676)** | **44 669** |
| Совокупный доход за период | | - | 244 | 30 | 2 767 | **3 041** |
| **31 декабря 2019 года** | | **45 318** | **5 265** | **36** | **(2 909)** | **47 710** |

## ЗАО «БТА БАНК»

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2019 ГОДА

(в тысячах белорусских рублей)

| | 2019 год | 2018 год |
|---|---|---|
| **Денежные потоки от операционной деятельности** | | |
| Проценты полученные | 16 403 | 11 072 |
| Проценты уплаченные | (10 115) | (5 906) |
| Комиссии полученные | 7 729 | 5 250 |
| Комиссии уплаченные | (662) | (395) |
| Реализованный доход за вычетом расходов по операциям с иностранной валютой | 2 565 | 1 175 |
| Расходы на персонал | (6 999) | (6 700) |
| Прочие полученные доходы | 1 258 | 2 065 |
| Прочие уплаченные расходы | (4 362) | (4 158) |
| **Денежные потоки от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах и уплаты налога на прибыль** | **5 817** | **2 403** |
| Чистое (увеличение) / уменьшение операционных активов | | |
| Средства в банках и иных финансовых учреждениях | (479) | (1 242) |
| Кредиты клиентам | (70 989) | (64 046) |
| Прочие активы | 1 705 | 65 |
| Чистое увеличение / (уменьшение) операционных обязательств | | |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | (4 386) | 13 634 |
| Средства клиентов | 130 807 | 29 977 |
| Прочие обязательства | 150 | (85) |
| **Чистые денежные потоки от операционной деятельности до налога на прибыль** | **62 625** | **(19 294)** |
| Уплаченный налог на прибыль | (360) | (242) |
| **Чистое расходование денежных средств от операционной деятельности** | **62 265** | **(19 536)** |
| Денежные потоки от инвестиционной деятельности | | |
| Продажа ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | 46 158 | 61 196 |
| Покупка ценных бумаг, оцениваемых по справедливой стоимости в составе прочего совокупного дохода | (58 288) | (60 417) |
| Поступления от выбытия основных средств и нематериальных активов | (338) | 169 |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | 8 | (477) |
| **Чистое поступление денежных средств от инвестиционной деятельности** | **(12 460)** | **471** |
| Денежные потоки от финансовой деятельности | | |
| Выпуск облигаций | 190 763 | 142 028 |
| Погашение облигаций, выпущенных банком | (173 541) | (127 652) |
| Платежи в отношении основной суммы обязательства по аренде | (353) | - |
| **Чистое поступление денежных средств от финансовой деятельности** | **16 869** | **14 376** |
| Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты | (653) | 764 |
| **Изменение денежных средств и их эквивалентов** | **66 021** | **(3 925)** |
| **Денежные средства и их эквиваленты, на начало года** | **22 114** | **26 039** |
| **Денежные средства и их эквиваленты (до вычета резерва), на конец года** | **88 135** | **22 114** |

**Подписано и утверждено к выпуску от имени Правления Банка:**

Доронкевич А.В.
Председатель Правления
17 апреля 2020 года

Ковалева Т.Н.
Главный бухгалтер
17 апреля 2020 года

BDO

Тел. +375 17 308 74 50
Факс +375 17 308 74 51
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр-т Победителей, 103,
этаж 8, помещение 7
Минск, Беларусь
220020

# АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Национальному банку Республики Беларусь,

Акционерам, Совету директоров, Правлению Закрытого акционерного общества «БТА Банк»,

Исх. № 04-05/58

Дата: 17 апреля 2020 года

**Реквизиты аудируемого лица:**
**Наименование:** Закрытое акционерное общество «БТА Банк» (сокращенное наименование банка – ЗАО «БТА Банк»)

**Место нахождения:** Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 20-2.

**Сведения о государственной регистрации:** Закрытое акционерное общество «БТА Банк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 25 июля 2002 года, регистрационный номер 807000071

**УНП:** 807000071

## Аудиторское мнение

Мы провели аудит финансовой отчетности ЗАО «БТА Банк» (далее – «Банк»), состоящей из:

- Отчета о финансовом положении по состоянию на 31 декабря 2019 года;
- Отчета о совокупном доходе, отчетов об изменении собственного капитала и движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату; а также
- Примечаний к финансовой отчетности, включающих краткое изложение основных положений учетной политики.

По нашему мнению, прилагаемая финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение ЗАО «БТА Банк» по состоянию на 31 декабря 2019 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности (далее – «МСФО»).

## Основание для выражения аудиторского мнения

Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита (далее – «МСА»). Наши обязанности, предусмотренные указанными стандартами, более подробно рассматриваются в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности» настоящего заключения. Мы являемся независимыми по отношению к ЗАО «БТА Банк» в соответствии с Кодексом этики профессиональных бухгалтеров, опубликованным Комитетом по международным этическим стандартам для бухгалтеров, и выполнили наши иные этические обязанности в соответствии с требованиями данного Кодекса. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и нормы профессиональной этики.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

## Ключевые вопросы аудита

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита финансовой отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита финансовой отчетности в целом и при формировании нашего мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам. В отношении каждого из указанных ниже вопросов наше описание того, как соответствующий вопрос был рассмотрен в ходе нашего аудита, приводится в этом контексте.

Мы выполнили обязанности, описанные в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности» нашего заключения, в том числе по отношению к этим вопросам. Соответственно, наш аудит включал выполнение процедур, разработанных в ответ на нашу оценку рисков существенного искажения финансовой отчетности. Результаты наших аудиторских процедур, в том числе процедур, выполненных в ходе рассмотрения указанных ниже вопросов, служат основанием для выражения нашего аудиторского мнения о прилагаемой финансовой отчетности.

**Резерв под обесценение кредитов клиентам, а также резерв по обязательствам кредитного характера**

В связи с существенностью резерва под обесценение кредитов клиентам и обязательств кредитного характера для финансового положения Банка, а также в связи со сложностью и необходимостью применения суждений в отношении оценки ожидаемых кредитных убытков в соответствии со стандартом МСФО (IFRS) 9 «Финансовые инструменты» (далее – «МСФО 9»), данный вопрос является одним из ключевых вопросов аудита.

Для определения значительного увеличения кредитного риска с даты первоначального признания, как на индивидуальной, так и на портфельной основе, а также для расчета ожидаемых кредитных убытков (далее – «ОКУ») необходимо применять суждение. Оценка увеличения кредитного риска основана на относительном изменении в кредитных рейтингах, длительности просроченной задолженности и прочих объективных и субъективных факторах. Выбор пороговых значений, при которых увеличение кредитного риска признается значительным, таких как величина ухудшения кредитного рейтинга, также носит субъективный характер.

В ходе нашего аудита мы обратили особое внимание на следующее:

- оценка моделей кредитного риска и допущений, используемых для определения ключевых параметров резервирования и ожидаемых кредитных убытков по портфелю;
- оценка суждений руководства в отношении выявления значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе, с использованием количественных и качественных критериев;
- тестирование ожидаемых будущих денежных потоков, в том числе денежных потоков, источником которых является обеспечение, в отношении существенных кредитно-обесцененных кредитов клиентам и обязательств кредитного характера.

Наши аудиторские процедуры включали оценку методологии расчета ожидаемых кредитных убытков, разработанной Банком в соответствии с МСФО 9 для оценки резервов под обесценение кредитов клиентам, а также обязательств кредитного характера.

Расчет ОКУ включает методики оценки, в которых используются существенные ненаблюдаемые исходные данные и факторы, такие как внутренние кредитные рейтинги, а также комплексное статистическое моделирование и экспертное суждение. Данные методики используются с целью определения вероятности дефолта, величины кредитного требования, подверженной риску дефолта и уровня потерь при дефолте на основании имеющихся исторических данных и внешней информации, скорректированных с учетом прогнозов, включая прогнозные макроэкономические переменные.

Для расчета ожидаемых кредитных убытков в отношении существенных финансовых активов, подвергнувшихся кредитному обесценению на индивидуальной основе, требуется анализ финансовой и нефинансовой информации и широкое использование допущений. Оценка будущих денежных потоков основывается на таких существенных ненаблюдаемых исходных данных, как текущие и прогнозные финансовые показатели заемщика, стоимость обеспечения и оценка вероятности возможных сценариев. Использование иных методик моделирования, допущений и прогнозов может привести к существенно иным оценкам резерва под ожидаемые кредитные убытки.

Информация о резерве под ожидаемые кредитные убытки в отношении кредитов клиентам, а также обязательств кредитного характера представлена в Примечании 9 «Кредиты клиентам» и Примечании 20 «Договорные и условные обязательства, условные активы», Примечании 25 «Управление рисками» к финансовой отчетности.

Мы оценили разумность факторов кредитного риска и пороговых значений, выбранных руководством для определения значительного увеличения кредитного риска на индивидуальной и портфельной основе. Мы оценили последовательность применения критериев, выбранных руководством, на отчетную дату.

При тестировании обесценения, рассчитанного на портфельной основе, мы проанализировали лежащие в основе статистические модели, ключевые исходные данные и допущения, а также прогнозную информацию, используемую при расчете ожидаемых кредитных убытков. Для выбранных существенных кредитов, мы провели проверку внутренних кредитных рейтингов, факторов кредитного риска и классификацию по стадиям. В отношении выбранных нами существенных обесцененных корпоративных кредитов, мы, совместно со специалистами в области оценки, проанализировали допущения в отношении будущих денежных потоков, включая стоимость обеспечения и вероятность возможных сценариев. Мы рассмотрели результаты проведенного Банком последующего тестирования моделей, применяемых для целей МСФО 9.

Мы также изучили раскрытия в финансовой отчетности Банка касательно резерва под ожидаемые кредитные убытки по кредитам клиентам, а также под обязательства кредитного характера.

## Прочие вопросы

Аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «БТА Банк» за год, закончившийся 31 декабря 2018 года, был проведен другой аудиторской организацией, которая выразила немодифицированное аудиторское мнение о данной отчетности в аудиторском заключении от 14.05.2020.

## Обязанности аудируемого лица по подготовке финансовой отчетности

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление финансовой отчетности в соответствии с МСФО и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке финансовой отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в финансовой отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки финансовой отчетности аудируемого лица.

## Обязанности аудиторской организации по проведению аудита финансовой отчетности

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что финансовая отчетность аудируемого лица не содержит существенных искажений вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий, и в составлении аудиторского заключения, включающего выраженное в установленной форме аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с МСА, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения. Искажения могут возникать в результате ошибок и (или) недобросовестных действий и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей финансовой отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с МСА, аудиторская организация применяет профессиональное суждение и сохраняет профессиональный скептицизм на протяжении всего аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры, в соответствии с оцененными рисками, направленные на снижение этих рисков; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения искажений в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие, таких как сговор, подлог или подделку документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей отношение к аудиту финансовой отчетности, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованности учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности, и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в финансовой отчетности. В случае, если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.

Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или, когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Заместитель директора BDO в Беларуси — Н.В. Ляховченко

Аудитор, возглавлявший аудит — И.И. Коваленко

Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь

Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 17 апреля 2020 года

СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРЕ:

| | |
|---|---|
| *Наименование:* | Общество с ограниченной ответственностью «БДО» |
| *Место нахождения:* | Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7 |
| *Сведения о государственной регистрации:* | Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года |
| *УНП:* | 190241132 |

## ТАЯМНІЦЫ І АДКРЫЦЦІ

### Вітаміны з космасу

# СВАЯ ЦЯПЛІЧКА НА АРБІЦЕ

Астранаўты NASA паспяхова вырасцілі ядомыя расліны ў космасе. Першая атрыманая такім чынам салата аказалася абсалютна бяспечнай, пажыўнай і смачнай, як і тая, што расце на Зямлі, піша The Guardian. Праектам па вырошчванні расліны ва ўмовах космасу кіравала Джыоя Маса з Касмічнага цэнтра імя Кенэдзі. Яна лічыць, што прарыў можа быць крытычна важны для астранаўтаў падчас працяглых місій накшталт Artemis III, у рамках якой да 2024 года група людзей павінна высадзіцца на паверхні Месяца ў раёне паўднёвага полюса. А першая пілатуемая місія NASA на Марс можа адправіцца ў канцы 2020-х гадоў.



«Калі захоўваць упакаваную ежу даволі доўга, яе якасць, смакавыя якасці і пажыўнасць пагаршаюцца. Вітаміны дэградуюць. Мы не можам зараз гарантаваць, што астранаўты атрымаюць патрэбную колькасць ежы», — сказала яна. «Акрамя таго, можа быць таксама псіхалагічная карысць ад вырошчвання раслін і догляду за імі», — дадала навуковец.

Харчаванне для астранаўтаў за апошнія гады палепшылася. Усё, што адпраўляецца на МКС, павінна дасягнуць адзнакі 6 і вышэй па шкале пераваг ад 1 да 9, дзе 1 — гэта «горшае, што калі-небудзь даводзілася каштаваць». Але, нават нягледзячы на такія зрухі, астранаўтам надакучваюць адны і тыя ж стравы з вакуумных упаковак. «Шмат хто з іх страчвае вагу», — сказала Маса.

Салату вырошчвалі ў сістэме пад назвай Veggie, якая складаецца з грунтовай падушкі, LED-асвятлення і сістэмы паліву. Апошнюю астранаўты павінны запраўляць праз адмысловую трубку. Ураджаі расліны вырошчваюць на працягу 33—56 дзён, перш чым сарваць і з'есці ці замарозіць і адправіць на Зямлю для хімічнага і біялагічнага аналізу. Астранаўты праціралі лісце салаты дэзынфіцыраванымі сурвэткамі, перш чым есці.

«Мы не хочам, каб нехта захварэў. Таму мы рабілі ўсё гэта», — сказала Маса. Вырашчаная ў космасе салата была падобная па структуры на тую, што расце на Зямлі, а некаторыя расліны нават аказаліся багацейшымі на калій, натрый, фосфар і цынк. У іх таксама быў высокі ўзровень бактэрый. Верагодна, гэта адбылося таму, што касмічныя расліны развіваліся ў больш цёплай, вільготнай і закрытай сістэме. Аднак навукоўцы не выявілі ніякіх шкодных бактэрый накшталт кішачнай палачкі або сальманелы. Цяпер NASA збіраецца пашырыць шэраг ядомых відаў раслін, якія будуць вырошчваць на МКС. У прыватнасці, у арганізацыі плануюць заняцца касмічнай вытворчасцю бок-чою, латука і чырвонай капусты, а таксама памідораў і перцаў. Пачатак эксперымента запланаваны ўжо на гэты год.

### Думай галавой

# НЕ ПЕРАТВАРАЙЦЕ МОЗГ У ЗВАЛКУ

**Выкарыстанне гаджэтаў і камп'ютараў спрыяе развіццю маразму і дэпрэсіі, сцвярджаюць японскія навукоўцы. Пра вынікі даследавання паведаміла выданне Nikkei Style.**

Па словах дырэктара клінікі памяці «Акумура» Аюмі Акумуры, у апошнія гады ўсё часцей людзі ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў скардзяцца на праблемы з памяццю. Паводле слоў спецыяліста, яе парушэнню спрыяе празмернае захапленне смартфонамі і камп'ютарамі, якія фактычна ператвараюць мозг у «звалку», калі ён не спраўляецца з аб'ёмамі інфармацыі.

Акрамя таго, прафесар-нейрахірург Есікуні Эдагава ўказаў, што за ўпарадкаванне інфармацыі ў мозгу адказвае прэфрантальная кара ў лобнай долі, якая таксама рэгулюе мысленне і кантралюе памяць і эмоцыі. Пры перагрузцы мозга інфармацыяй работа гэтых функцый парушаецца, зніжаюцца кагнітыўныя здольнасці, з'яўляюцца раздражненне і расчараванне, падае матывацыя. Навукоўцы адзначаюць, што неабходна даваць мозгу адпачынак, скарачаць час карыстання камп'ютарамі і смартфонамі, а таксама добра спаць. Па іх словах, карысна задрамаць хоць бы 15 хвілін падчас абедзеннага перапынку.

«Нават калі вы сядаеце на крэсла, заплюшчваеце вочы, выпраўляеце паставу і засяроджваецеся на дыханні на працягу пяці хвілін — гэта эфектыўна», — гаворыцца ў артыкуле.



### Бяспечна есці!

# ЯЙКІ ДЛЯ ЗДАРОВАГА СЭРЦА

**Памятаеце фразу героя Фрунзіка Мкртчана з савецкага фільма «Адзінокім прадастаўляецца інтэрнат»? «Ранкам яешня, удзень яешня, увечары яешня, а ноччу — амлет! Хутка я буду кудахтаць як кураня!»**



Там, праўда, гаворка ішла найперш пра кулінарныя здольнасці спадарожніцы жыцця, але муж відавочна падсвядома адчуваў схаваную пагрозу на іншым узроўні, а не толькі для страўніка. І меў рацыю! Спецыялісты са Школы грамадскай аховы здароўя Гарвардскага ўніверсітэта назвалі колькасць яек, штодзённае ўжыванне якой не прынясе шкоды сардэчна-сасудзістай сістэме. Вынікі даследавання апублікаваныя CNN Health.

«Умеранае спажыванне — да аднаго яйка ў дзень — не звязана з павышанай рызыкай сардэчна-сасудзістых захворванняў. Вы можаце з'есці на сняданак і два яйкі, але не больш за адзін або два разы на тыдзень», — да такой высновы прыйшоў загадчык кафедры харчавання ў Школе грамадскай аховы здароўя імя Чана Гарвардскага ўніверсітэта доктар Фрэнк Ху.

Даследаванне праводзілася на працягу 34 гадоў з удзелам 215 тысяч жанчын і мужчын, якія першапачаткова не мелі сур'ёзных хранічных захворванняў.

Людзям, якія пакутуюць на дыябет 2-га тыпу, рэкамендавалі спажываць яйкі радзей з-за павышанай рызыкі ўзнікнення сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Таксама было адзначана, што ў жыхароў азіяцкіх краін ужыванне гэтага прадукту харчавання значна радзей выклікае сардэчна-сасудзістыя паталогіі. Магчыма, гэта звязана з тым, што ў тамтэйшай кухні яйкі ўваходзяць у састаў іншых страў, а не выкарыстоўваюцца ў ежу асобна.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

*У параўнанні з парэчкай або малінай бружмель — зусім не папулярная ягада сярод садоўнікаў. І гэта больш, чым дзіўна, таму што такі непераборлівы куст яшчэ трэба пашукаць.*

# ВЫРОШЧВАННЕ БРУЖМЕЛЮ

Бружмель устойлівы да нізкіх тэмператур, практычна не пашкоджваецца хваробамі і не баіцца шкоднікаў, можа пладаносіць у паўцені, раней за ўсіх радуе ураджаем, утрымлівае ў сабе мноства вітамінаў і мікраэлементаў, дапамагае прадухіліць цэлы «букет» захворванняў. Калі на вашым участку яшчэ не расце гэтая дзіўная ягада, не разважайце і абавязкова пасадзіце некалькі кусцікаў.



Бружмель мае патрэбу ў крыжаваным апыленні. Гэта значыць, што для атрымання добрых ураджаяў неабходна мець на ўчастку некалькі кустоў розных гатункаў бружмелю (як мінімум 3—4). Ад аднаго куста ягад не дачакаешся.

### Пасадка

Першая і, мабыць, адзіная складанасць у вырошчванні бружмелю — гэта выбар месца для пасадкі. Справа ў тым, што гэты куст аддае перавагу адначасова сонечным, але зацішным і вільготным месцам. Уладальнікам забалочаных участкаў у гэтым плане пашанцавала больш, а вось на сухіх глебах знайсці сонечнае, але ў той жа час не засушлівае і абароненае ад ветру месца даволі цяжка. Таму часцяком бружмель саджаюць у паўцень, напрыклад уздоўж плота. Бружмель высаджваюць як увесну, так і ўвосень. Увесну пасадку праводзяць у маі, восенню — у сярэдзіне верасня. Перш за ўсё, як заўсёды, трэба падрыхтаваць пасадачную яму. Ямы для бружмелю выкопваюць дыяметрам і глыбінёй у сорак сантыметраў, захоўваючы адлегласць паміж кустамі ў 1,5–2,5 метра. Адлегласць залежыць ад сорту: для слабарослых кусцікаў дастаткова паўтара метра, а для моцнарослых — ніяк не менш за два. У кожную яму высыпаюць па два вядры кампосту, па 200 грамаў попелу і па 50 грамаў суперфасфату. Унутры ямкі робяць невялікі пагорак. У высадка падразаюць сухія і пашкоджаныя карэньчыкі, акуратна ўсталёўваюць яго на пагорак і выпростваюць карані так, каб яны звісалі па ўсіх краях бугарка. Затым лунку прысыпаюць невялікай колькасцю зямлі (а яшчэ лепш кампосту) і паліваюць. Гэта трэба для забеспячэння лепшага кантакту каранёў з зямлёй. Далей яму запаўняюць грунтам да канца, злёгку прытоптваюць і яшчэ раз багата паліваюць. Бружмель вельмі вільгацелюбівы, таму пасля пасадкі важна не дапусціць выпарэння вады. Як звычайна, нашым памочнікам у гэтай справе стане мульча. Абавязкова замульчыруйце саджанцы пластом газет або кардону, а зверху скошанай травой або саломай. Такое мульчыраванне не толькі захавае жыватворную вільгаць, але і не прапусціць ніякага пустазелля. Але калі вы пасадзілі бружмель вясной, а лета выдалася засушлівым, нават замульчыраваным маладым кусцікам спатрэбіцца багаты паліў. Не забывайце пры высадцы чаргаваць сарты — гэта аптымальны спосаб забяспечыць апыленне, а значыць, і завязь. Што ж, бружмель высаджаны. Ужо на другі-трэці год пасля пасадкі можна чакаць з'яўлення першых ягад.

### Падкормка, паліў, мульчыраванне

Каранёвая сістэма ў бружмелю размяшчаецца ў паверхневых пластах глебы, таму зямлю вакол кустоў рыхліць не трэба. Затое на мульчыраванне і падкормкі ягада адказвае з удзячнасцю. Так што на працягу ўсяго сезона варта перыядычна падсыпаць пад бружмель траву, пілавінне, салому і тры разы падкарміць кусцікі пад корань (па тры літры падкормкі на расліну).

Першая падкормка праводзіцца ў час цвіцення. Для яе выкарыстоўваюць адвар бульбяной лупіны з попелам. У вядро кіпячай вады дадаецца літровы слоік лупіны, яно ахінаецца чымсьці цёплым і астуджаецца да 50 °С. Затым у вядро дадаецца шклянка попелу і такім, яшчэ гарачым настоем падкормліваецца куст.

Другі раз бружмель падкормліваюць падчас завязвання ягад настоем біягумусу: шклянку біягумусу настойваюць суткі ў вядры вады пакаёвай тэмпературы.

Трэцюю падкормку ўносяць пасля збору ягад. Кусты паліваюць травяным угнаеннем з даданнем попелу.

У кастрычніку для падрыхтоўкі да зімы апошні раз неабходна замульчыраваць бружмель кухоннымі адкідамі і кампостам — па вядры таго і другога пад кожны куст.

### Абрэзка

Бружмель утварае ягады выключна на парастках бягучага года, на старых галінках ягад не бывае. Таму кусты бружмелю раяць амалоджваць раз у 3—6 гадоў. Для амалоджвання куста выразаюць усе старыя і слабыя парасткі, пакідаючы па 3—5 самых магутных. Калі куст ужо вельмі стары, яго можна амаладзіць, скараціўшы ўсе галінкі да нізу. Пры добрым паліве і падкормах новыя парасткі адрастаюць вельмі хутка, куст аднаўляецца і аднаўляе пладанашэнне. У прамежкавых гадах паміж амаладжальнымі абрэзкамі дастаткова восенню выразаць сухія, паламаныя галінкі, а таксама парасткі, якія растуць унутр куста, каб не дапусціць загусцення. Напрыканцы яшчэ адна невялікая парада: падчас збору ягад рэкамендуюць рассцілаць пад куст бружмелю плёнку або кавалак тканіны. Ягады паспяваюць нераўнамерна, і пры зборы пераспелыя проста падаюць на зямлю. Тканіна або плёнка дапаможа не ўпусціць ні грама каштоўнага ўраджаю.

### Спытайце пра радзіннае

# Чаму ў год жалобы не спраўляюць вяселле?

**«Патлумачце, чаму нельга выходзіць замуж у той год, калі памёр нехта з блізкіх», — пытаецца Ганна В. з Брэста.**

Шматузроўневая сістэма абмежаванняў-рэгламентацый на правядзенне вяселляў (дзень тыдня, фаза Месяца, святы народнага календара, высакосны год, час пастоў і інш.), якая існавала сярод усходніх славян, будзе няпоўнай, калі не ўлічыць яшчэ адзін важны фактар, які выклікае мноства самых супярэчлівых тлумачэнняў, — смерць кагосьці з бацькоў маладых або іх блізкіх сваякоў. Даволі часта можна пачуць такое меркаванне: «У гэтым выпадку вяселле неабходна адкласці на 40 дзён». Напэўна, яно грунтуецца на той падставе, што ў праваслаўнай традыцыі саракавы дзень лічыцца днём, калі душа памерлага паўстае перад Богам для вызначэння яе далейшага лёсу (так званы Судны дзень), пасля чаго мы ўжо не ў стане нашкодзіць душы сваімі нерэгламентаванымі паводзінамі. Аднак гэта не зусім так.

У адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі народнай культуры смерць роднага чалавека выключала сям'ю памерлага з цыклу святочных абрадаў роўна на год. Да ліку родных адносяцца прадстаўнікі 1-й і 2-й ступені сваяцтва як па вертыкальнай шкале адносін (бабуля — дзядуля, бацька — маці, іх дзеці і ўнукі), так і па гарызантальнай — родныя і стрыечныя браты і сёстры.

Пахавальнаму абраду быў нададзены самы высокі культурны статус у сферы жыццядзейнасці традыцыйнага грамадства. Яго значнасць настолькі вялікая, што, мабыць, дасягае абсалюту ў культуралагічным разуменні гэтага слова. Толькі гэты абрад (а дакладней, падзея, якую ён суправаджае) у стане адмяніць або выцесніць на другі план любы з рытуальна-абрадавых комплексаў як народнай, так і хрысціянскай накіраванасці (што не ў стане зрабіць абрады, звязаныя з нараджэннем чалавека і яго вяселлем). Гэта абмежаванне датычыцца перш за ўсё такіх сацыяльных інстытутаў, як сям'я і Род.

У традыцыйным светапоглядзе беларусаў, рускіх і ўкраінцаў пахавальны абрад быццам прыпыняў звычайную хаду часу (першае рытуальнае дзеянне, пасля таго як наступіла смерць, — спыняюць гадзіннік) і запускаў механізм дзеяння зусім іншага прынцыпу яго вылічэння. У выпадку смерці роднага чалавека сям'я памерлага тут жа «выпадае» (выключаецца) з традыцыйнага святочнага календара, у якім адзначаліся Каляды, Масленіца, Вялікдзень, Купалле і ўсе іншыя святы гадавога кола. Такая сям'я пераходзіць у прастору дзеяння пахавальна-памінальнага цыклу абрадаў, працягласцю адзін год. У сям'і наступіў час, які патрабуе не працілеглых святочным, а зусім іншых нормаў паводзін, для якіх характэрна стрыманасць, нешматслоўнасць, іншая сімволіка ў адзежы (дамінуе цёмны колер); за гэтым сталі значныя змены і ў сістэме грамадскіх адносін (нельга браць удзел у святочных імпрэзах, спяваць, танцаваць і г. д.) і цэлы шэраг абмежаванняў у сферы гаспадарчай дзейнасці (забарона на любыя рамонтна-будаўнічыя работы).

Яшчэ раз уважліва паглядзім на разгорнуты ў прасторы «вектар» пасляcмяротнага часу даўжынёй у год. На ім вызначаюцца 5 абрадавых сітуацый, чатыры з якіх (маюцца на ўвазе ўсе жалобныя сталы) тыпалагічна падобныя: 0 — момант смерці (спыняецца гадзіннік); 3 дзень — дзень пахавання, «Траціны» — 1-ы сямейна-родавы памінальны стол; 9 дзень — «Дзевяціны» — 2-і сямейны (!) памінальны стол; 40-ы дзень — «Саракавіны» — 3-і сямейна-родавы памінальны стол; роўна праз год (12 месяцаў) — «Угодкі» — 4-ы сямейна-родавы, заключны памінальны стол. Усе іншыя падзеі (напрыклад, святы як народнага, так і хрысціянскага календара) на гэтым «вектары» адсутнічаюць, што абумоўлена ўяўленнямі нашых продкаў, у тым ліку і хрысціянскімі, пра стан душы пасля смерці і пераадоленні выпрабаванняў на яе шляху праз церніі да зорак. Кожны з памінальных рытуалаў быў падпарадкаваны «падзеям», звязаным з паступальным пераходам душы памерлага ў іншы свет: 0 — душа пакідае цела, 3 дзень — душа пакідае хату; 9 дзень — душа пакідае зямлю; 40 дзень — душа прадстае перад Богам, Судны дзень; праз 1 год пасля смерці душа знаходзіць вечны спакой.

Прыведзеная схема-разважанне пераканаўча паказвае, што з моманту смерці чалавека і да саракавога дня мы, узгадваючы яго імя, павінны прамаўляць сакральную формулу «Зямля яму пухам» (якая ўтрымлівае ў сабе два планы рэалізацыі: перасцярога-экран — для жывых і пажаданне — для памерлага). Пасля саракавога дня і да года павінна гучаць зусім іншая формула-пажаданне: «Царства яму нябеснае». Пасля года актуалізуецца трэцяя формула: «Вечны спакой».

Такім чынам, смерць кагосьці з блізкіх сваякоў стварае тую выключную сітуацыю, калі Род у цэлым жыве па звычайным календары, а вось самая блізкая радзіна (уключаючы першую і другую ступень сваяцтва), гэта значыць сям'я памерлага, аказваюцца ў жыццёвым «залюстроўі», у зоне «трыдзявятага царства», падпарадкоўваючыся дзеянню ўніверсальнага рытму пасляcмяротных памінанняў.

«Побытавы» час, вядома ж, цячэ: людзі па-ранейшаму выконваюць усе неабходныя работы, займаюцца хатняй гаспадаркай, не пакідаюць без увагі шырокі комплекс земляробчых заняткаў. Але не больш за тое: любая святочная падзея — не для іх.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый ды абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*

## Даты. Падзеі. Людзі

**13 МАЯ**

**У краіне**

**1840** год — нарадзіўся Цітус Якуб Далеўскі, удзельнік вызваленчага руху ў Беларусі і ў Літве і паўстання 1863—1864 гадоў. Найбліжэйшы паплечнік Кастуся Каліноўскага.

**1870** год — нарадзіўся Аляксандр Адольфавіч Турчыновіч, беларускі гісторык, краязнавец, педагог. Выкладаў старажытныя мовы і ўсеагульную гісторыю ў сярэдніх навучальных установах Магілёва, Вільні, Гродна, Пецярбургскай 6-й гімназіі. Адзін з ініцыятараў правядзення ў Беларусі вучнёўскіх адукацыйных экскурсій. Аўтар прац па гісторыі Гродзеншчыны, па антычнай культуры, лацінскай мове.

**1905** год — нарадзілася Стэфанія Міхайлаўна Станюта, актрыса, народная артыстка Беларусі, народная артыстка СССР. На яе творчым рахунку больш за 60 роляў у кіно і на тэлебачанні («Белыя Росы», «Чужая бацькоўшчына», «Мама, я жывы» і іншыя). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1950** год — нарадзілася Людміла Якаўлеўна Колас, спявачка, заслужаная артыстка Беларусі. Лаўрэат 8-га Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі, Міжнароднага конкурсу «Новыя оперныя галасы». Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

**1950** год — нарадзіўся Юрый Андрэевіч Курачкін, беларускі фізік-тэарэтык, доктар фізіка-матэматычных навук.

**У свеце**

**1840** год — нарадзіўся Альфонс Дадэ, французскі пісьменнік. Аўтар трылогіі пра Тартарэна («Незвычайныя прыгоды Тартарэна з Тараскона» і іншыя творы), раманаў «Набоб», «Каралі ў выгнанні» і іншых.

**1850** год — нарадзіўся Мадэст Ільіч Чайкоўскі, рускі драматург, лібрэтыст, літаратурны і музычны крытык, перакладчык. Малодшы брат Пятра Чайкоўскага, аўтар яго першай дакументальнай біяграфіі, заснавальнік музея кампазітара ў Кліна.

**1950** год — нарадзіўся Стыві Уандэр, амерыканскі эстрадны спявак, музыкант і кампазітар, выканаўца ў стылі поп і рытм-энд-блюз. Шматразовы лаўрэат прэміі «Грэмі». Яго імя ўключана ў спіс членаў амерыканскай «Залы славы рок-н-рола».



**1950** год — у брытанскім горадзе Сільверстоўн адбылася першая гонка чэмпіянату «Формула-1».

**Так гаварыў...**

**Васіль БЫКАЎ:**
*«Пакуты робяць чалавека чалавекам. Чалавек без пакут — трава».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.10 | 21.03 | 15.53 |
| Віцебск | — 4.54 | 20.59 | 16.05 |
| Магілёў | — 5.00 | 20.53 | 15.53 |
| Гомель | — 5.03 | 20.43 | 15.40 |
| Гродна | — 5.26 | 21.17 | 15.51 |
| Брэст | — 5.34 | 21.11 | 15.37 |

### Месяц

***Поўня 7 мая.***
***Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.*** *Даната, Ігната, Максіма, Мікіты, Якава.*
***К.*** *Жанны, Магдалены, Андрэя, Германа, Роберта.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— Пятро! Колькі разоў я табе сёння казала, што нельга быць такім скрупулёзным!
— Сем.

**— Я запрасіла цябе выпіць за маё здароўе, а ты хлебчаш ужо восьмую шклянку...**
**— Ну, шо рабіць!.. Я не вінаваты, шо ты сёння так дрэнна выглядаеш...**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1439.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 мая 2020 года.